незалежная газета

№ 31 (676) 18 жніўня 2010

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыдня, у серады



**КДБ помсціць Дзяржкантролю**

Старонка 5



**Лявон Вольскі: «Усе за стол!»**

Старонка 11



**Сэкс у Вялікім Княстве**

Старонка 10

## У НУМАРЫ

**Міліцыянт — непапулярная прафесія**

Акадэмія МУС здзіўляе нізкімі прахаднымі баламі. Чаму так? **Старонка 2.**

**Расійскі алігарх збудуе ў Беларусі завод**

Урад краіны ўсё ж падпісаў інвестыцыйную дамову з Брынцалавым. **Старонка 4.**

**Пазняк: Лозунг «Абы не Лукашэнка» шкодны**

А Някляеў засведчыў сваю 100%-ю прарасійскасць. **Старонка 7.**

**Як не плаціць за гатэль на адпачынку**

Скарыстайце гасцявыя сеткі. **Старонка 15.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

ТУРЫСТЫЧНАЕ АГЕНЦТВА
«ГІСТОРЫЯ-ТУР»
- Тур на фестываль «Гальшанскі замак», 21.08.2010 (папярэдні продаж квіткоў і арганізаваная дастаўка транспартам)
- Аўтобусныя экскурсіі па Беларусі
- Адпачынак у Еўропе і на моры
- Карпаратыўны адпачынак у шляхецкім фальварку Карчэўскіх, што ў Бянюнах
(029) 677 00 46 www.h-t.by
УНП 590883064. Лц. № 02310/0531453 г. МСІТ выд. 21.09.2009 да 21.09.2014

# Масква паставіла дыягназ

**Выйшаў «Хросны бацька–3» — мазаічны.**

У нядзелю на расійскім тэлеканале НТВ выйшла трэцяя частка нашумелага фільма «Хросны бацька».

У Беларусі перадачу, як звычайна, можна было пабачыць толькі па спадарожніку.

Трэцяя частка серыяла амаль цалкам была прысвечаная сям'і і асабістаму жыццю Аляксандра Лукашэнкі. Фільм абяцаў адказаць на пытанні: што такое сям'я Лукашэнкі, як яна зарабляе грошы, дзе іх захоўвае і як траціць? У бонус таксама прапаноўвалася тэма, чаму Лукашэнку камісавалі з войска.

Праграма пачынаецца кадрамі з фільма «На спіне ў чорнага ката», дзе галоўную ролю выконвала ўнучка кіраўніка краіны Віка Лукашэнка. Зазначалася, што сыграць у фільме не адмовіўся нават папулярны расійскі папсовы выканаўца Філіп Кіркораў. «Адмаўляць прэзідэнцкай сям'і ў Беларусі не прынята», — казаў закадравы голас.

### След Віктара

Варта адзначыць, што, у адрозненне ад папярэдніх частак, гэтая здымалася сёлета. Беларускія ўдзельнікі для здымак ездзілі адмыслова ў Маскву.

Перш-наперш аўтар вырашыў пазнаёміць гледачоў з Аператыўна-аналітычным цэнтрам — новай беларускай спецслужбай. Тут аўтары адразу зрабілі памылку, бо афіцыйна цэнтрам кіруе не Віктар Лукашэнка, а Валер Вакульчык. Старэйшы сын беларускага лідэра толькі курыруе гэтую структуру.

Праваабаронца Алег Воўчак расказаў пра «маладых ваўкоў» Віктара Лукашэнкі, як яны занялі ўсе ключавыя пасады ў краіне. У тым ліку пазбавіліся ад уплывовага Віктара Шэймана. Тут адразу ўспамінаецца пра тэракт на дзень рэспублікі ў 2008 годзе. Тэлевізійнікі адзначаюць, што выбух быў зроблены «з ювелірнай дакладнасцю».

Высланы ў свой час з Беларусі палітолаг Андрэй Суздальцаў наўпрост звязаў выбух з процістаяннем Віктара Лукашэнкі і Віктара Шэймана. Нагадаем, праз пару дзён пасля здарэння кіраўнік дзяржавы адправіў Шэймана ў адстаўку, абвінаваціўшы яго ў непрадухіленні выбуху.



ЛИТОВСКИЙ КУРЬЕР

**Зімоўскі: «Ад Лукашэнкі чакаюць хаджэння ў Каносу». Старонка 9.**

«Лукашэнка нікому не давярае, апроч «роднай крыві», — пад гэтыя словы дэманструюцца рэдкія кадры Віктара і Дзмітрыя Лукашэнкі, якія сядзяць разам у хакейнай форме, а таксама спускаюцца па прыступках у нейкі рэстаран.

**Працяг на старонцы 8.**




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**200 чалавек у Мінску патрабавалі расследавання фактаў, прыведзеных у фільмах «Хросны бацька». Пікет адбыўся 16 жніўня каля Акадэміі навук.**

# У Падмаскоўі затрымалі Шэймана

**Ён ехаў з Масквы ў Мінск на джыпе «Таёта Лэнд Крузэр» на хуткасці 140 км/г.**

У Падмаскоўі супрацоўнікі дарожнай міліцыі 16 жніўня за перавышэнне хуткасці затрымалі джып Toyota Land Cruiser. Аўтамабіль вяртаўся з Масквы з хуткасцю 140 кіламетраў у гадзіну і нават выехаў на сустрэчную паласу, паведамляе сайт гарада Даўгапрудны, дзе адбыўся інцыдэнт. Аўтамабіль належаў генерал-палкоўніку Віктару Шэйману, памочніку прэзідэнта Беларусі па спецыяльных даручэннях. Ён жа знаходзіўся ў машыне.

Беларуская чыноўніка пэўны час суправаджаў міліцэйскі картэж, піша сайт. Потым па ўсіх пастах проста перадалі інфармацыю, каб аўтамабіль Шэймана не чапалі. Але міліцыянты на 131-м кіламетры шашы Масква—Мінск чамусьці пра гэта не ведалі.

Адкуль ехаў памочнік прэзідэнта па спецыяльных даручэннях? У Адміністрацыі прэзідэнта адказаць на гэтае пытанне адмовіліся. «Мы каментуем толькі інфармацыю, звязаную з кіраўніком краіны», — паведаміў супрацоўнік прэс-службы Адміністрацыі ў размове з карэспандэнтам «НН».

Чаму інфармацыю аб праверцы дакументаў дaішнікамі тонка выпусцілі ў СМІ? З улікам таго, што адносіны намінальных саюзніц апошнім часам абвастрыліся да звання, справа выглядае як палітычны сігнал Мінску.

**Мікола Бугай**

# Міліцыянт — непапулярная прафесія

## Акадэмія МУС здзіўляе нізкімі прахаднымі баламі. Чаму так?

Мужчыны не рвуцца, а дзяўчат не бяруць. Прахадныя балы для юнакоў нізкія. Для дзяўчат — наадварот, нябесныя. Але сёлета ў Акадэмію залічылі толькі 31 дзяўчыну, гэтая лічба скарочана ў параўнанні з леташнім наборам. Тлумачыцца гэта незапатрабаванасцю жанчын у прафесіі. А вось колькасць ахвотных прымерацць міліцэйскія спадніцы не паменшала.

Так, для залічэння на спецыяльнасць «Правазнаўства» следча-экспертнага факультэта для юнакоў дастаткова было набраць толькі 103 балы, а для дзяўчат — 291 (259 з вёскі). А на «Судовую экспертызу» для дзяўчат прахадны бал склаў 365 (169 для юнакоў), што супастаўна з самымі моднымі спецыяльнасцямі БДУ.

Сёлета не было набору на шэраг спецыяльнасцяў, у тым ліку на «Адміністрацыйна-прававую дзейнасць», дзе летась прахадныя балы былі яшчэ меншыя: 93 для юнакоў (224 для дзяўчат). На «Судовую экспертызу», для патрэбаў Памежнага камітэта і ў Маскоўскі ўніверсітэт па абмене прахадны бал склаў 169. На астатнія спецыяльнасці ён вагаецца між 103 і 168.

Чым выклікана такое нежаданне маладых людзей станавіцца міліцыянтамі? Чаму службу ў праваахоўных органах выбіраюць не самыя лепшыя выпускнікі школ? У прафесіі ж ёсць свае перавагі: заробкі, павышаная пенсія ў 45 гадоў, знаёмствы.

«Вы паглядзіце, якое з міліцыі пасмешышча зрабілі, — адмахваецца былы міліцыянер Мікалай Праскевіч. — Разумееце, ні аўтарытэту, нічога ў міліцыі няма. Цяпер, відаць, круцей атрымліваюць, калі ў турме пасядзяць, чым папрацуюць міліцыянерам».



PHOTO.BYMEDIA.NET

«Якое з міліцыі пасмешышча зрабілі, — адмахваецца былы міліцыянер Мікалай Праскевіч. — Ні аўтарытэту, нічога ў міліцыі няма».

Але ў той самы час шмат дзяўчат хочуць служыць у органах. Чым гэта абумоўлена?

«Дзяўчаты ж не ідуць у патрульна-паставую службу, у ДАІ, — кажа Праскевіч. — Яны ідуць у кабінеты працаваць. І гэтым усё сказана».

Сам Праскевіч паступаў яшчэ да службы ў войску ў Вышэйшую школу міліцыі. Быў вялікі конкурс. І ён не паступіў. Прыйшоў у міліцыю пасля арміі. Аддаў чвэрць стагоддзя прафесіі. Цяпер працуе ў ахове.

Пра свой жыццёвы выбар не шкадуе. Але сваіх дзяцей у міліцыю служыць сёння не пусціў бы. «Мой старэйшы сын хацеў ісці. Але я яго адгаварыў. І ён пайшоў у будаўнікі».

**Сяргей Макарэвіч**

### Сцісла

• **Начальнік цягніка Мінск-Масква абвінавачваецца ў незаконнай перапраўцы грамадзян Грузіі ў Расею.** Работнік чыгункі і яго памагаты з Каўказа перапраўлілі ў Расею каля ста чалавек. У дачыненні да мужчын распачатая крымінальная справа па ч.1 ст.371-1 «Арганізацыя незаконнай міграцыі» КК Беларусі, якая прадугледжвае да пяці гадоў пазбаўлення волі. Вядзецца следства. Падрабязнасці гэтай крымінальнай справы не раскрываюцца.

• **173 асобы падпісаліся за наданне адной з вуліц Зэльвы імя Ларысы Геніюш.** 100-годдзе выдатнай дзеячкі руху за незалежнасць Беларусі адзначаецца сёлета. «Апошнім часам перайменаванне амаль не практыкуецца», — такі адказ прыйшоў ініцыятарам уганаравання з Галоўнага ўпраўлення юстыцыі Гродзенскага аблвыканкама, куды яны даслалі подпісы за перайменаванне вуліцы Савецкай на вуліцу Геніюш. Сярод іншых прычын названа адсутнасць грошай на перарэгістрацыю і ўзнікненне цяжкасцяў у працы «Белпошты». Геніюш, сакратарка Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, да скону не прыняла грамадзянства СССР.

• **Башуру выставілі абвінавачванне.** Актывісту кампаніі «Гавары праўду» Міхасю Башуру прад'яўлена абвінавачанне па частцы 1 і 2 артыкула 380 Крымінальнага кодэкса «Падробка, выраб, выкарыстанне альбо збыт падробных дакументаў, штампаў, пячатак, бланкаў». Два гады таму, выступаючы паручыцелем жонкі, якая брала крэдыт, Башура нібыта прадставіў даведку аб заробку, у якой былі завышаныя даходы. Башура цяпер знаходзіцца ў турме на Акрэсціна.

• **У Мінску дрэвамі прыціснула пяць аўтамабіляў.** Пахаладанню да 23—25 градусаў папярэднічалі буры і навальніцы. Першая пранеслася над Мінскам у ноч з панядзелка на аўторак. Паламанымі дрэвамі прыціснула пяць аўто. Вецер таксама абярнуў летнюю кавярню на плошчы Незалежнасці.

• **З'явіліся фальшывыя білеты на Стынга.** З Гродна паступіла інфармацыя аб тым, што ў горадзе рэалізуюцца фальшывыя квіткі на канцэрт Стынга наміналам 350 тысяч рублёў. Арганізатары канцэрта просяць пакупнікоў звяртаць увагу на тое, што сапраўдныя білеты на канцэрт Стынга надрукаваныя на бланках Дзяржаўнай відовішчавай установы «Беларускі дзяржаўны цырк» і ўтрымліваюць вадзяныя знакі, а таксама серыю і нумар. Шоу «Сімфанісіці» адбудзецца ў «Мінск-Арэне» 18 верасня.

**СМ**

### АД РЭДАКЦЫІ

## Дзяржаўная датацыя за «Хроснага бацьку»

### «Саюздрукі» паказваюць нумар, што не з'явіўся ў кіёсках, як прададзены.

Рэдакцыя «НН» атрымала ад «саюздрукаў» звесткі па лічбах спісання газеты за ліпень. Да іх была асаблівая цікавасць, бо «НН» №25 ад 7 ліпеня з інфармацыяй пра фільм НТВ «Хросны бацька» сотні чытачоў не маглі адшукаць у шапіках па ўсёй краіне. А следам «НН» атрымала ад Міністэрства інфармацыі два папярэджанні за матэрыялы, якія тычыліся фільма і сітуацыі са зніклым нумарам.

Гродзенская і Гомельская вобласці даюць рэкордна нізкую за год лічбу. Малое спісанне і па Брэсцкай вобласці. Віцебскі «саюздрук», наадварот, даў у ліпені рэкордна вялікае. Хоць адсутнасць «НН» №25 з «Хросным бацькам» нам тлумачылі ў Віцебску тым, што газета «ўся прадалася». Але ў сярэднім лічбы не выходзяць за рамкі звычайнага — нібыта і не было шквалу званкоў ад чытачоў з усёй краіны, якія не знайшлі «НН» № 25 у кіёсках.

Гэтыя кур'ёзы змушаюць нас у чарговы раз засумнявацца ў рэалістычнасці лічбаў спісання. Механізм іх фармавання для нас непразрысты.

Калісьці забарону на продаж «НН» у «саюздруках» тлумачылі рашэннем «гаспадарчых суб'ектаў». Пасля сем гаспадарчых суб'ектаў увадначас перадумалі...

Факт застаецца фактам: дзяржаўныя органы вырашылі заплаціць за зніклы нумар незалежнай газеты. У дакументах ён значыцца як прададзены. Адпаведна, грошы за яго прыйдуць на рэдакцыйны рахунак. Праўда, тое, што даецца адной рукой, можа быць лёгка забрана другой: напрыклад, у выглядзе штрафа па выніках пазачарговай падатковай праверкі, якая цяпер трасе бухгалтэрыю «НН».

Дый што мяняе гэтая «датацыя»? Газеце вяртаюць грошы, якія яна і так законна атрымала б за прададзеныя асобнікі.

За адмену папярэджанняў Рэдакцыя будзе судзіцца з міністэрствам.

**Просім чытачоў, якія не знайшлі «НН» №25 у кіёсках, і гатовых сведчыць пра гэта ў судзе «НН» супраць Міністэрства інфармацыі, звязацца з Рэдакцыяй. Таксама звяртаемся да кіяскёрак, якія не атрымалі той нумар газеты. Гэта важна для абароны свабоды слова**

**Тэлефануйце:** (17) 284–73–29; (29) 613–32–32; (29) 707–73–29.
**Пішыце:** nn@nn.by. **Паштовы адрас:** а/с 537, Мінск, 220050

### Самае чытанае на nn.by за 11—17 жніўня

- «Хросны бацька»–3 — мазаічны. І дэбютуе Някляеў
- Вяселле Шапуцькі і Лабадзенкі адбылося ў Нясвіжы
- 200 чалавек выйшлі на акцыю салідарнасці са зніклымі
- Адзін ці два? Мілінкевіч вагаецца
- «Хросны бацька–3»: у нядзелю ўвечары — анонс
- «Час назад — 3» — учорашняя хохма для хроснага бацькі
- Шкоднасць частага сэксу
- Слова за слова — пікіроўка Лукашэнкі і Мядзведзева
- Заробкі за чэрвень у беларусаў і суседзяў — інфаграфіка
- Саннікаў: Мілінкевіч даўно не ўздымае пытанняў правоў чалавека

### nn@nn.by

#### Ланцуговая рэакцыя

Заўважыў: калі людзі чуюць беларускую мову, яны і самі пачынаюць гаварыць па-беларуску. Вось і сёння: купляю білет у касе вакзала. Стаю, правяраю яго і чую: харошая дзяўчына, якая стаяла за мной, таксама просіць свой, да Гомеля, па-беларуску.

**Павал Селех, Мінск**



# Не ўсё ў жыцці апошні раз!

## Падпіска праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перакazu дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езда.

**Банкаўскія рэквізіты (змяніліся з 1 мая):**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Аддз. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

## Падпіска праз «Белпошту»

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252.

Падпісацца можна на кожнай пошце.

## Дзякуй падпісчыкам,

якія падпісваюцца праз Рэдакцыю

Міколу Р. з Бярозаўскага раёна.
Міколу Т. з Асіповіцкага раёна.
Б.А. з Магілёва.
Ірыне З. з Смалявіцкага раёна.
Святлане К. з Ліды.
Таццяне Б., С.К., Паўлу С. з Мінскага раёна.
Уладзіміру М. з Гомельскага раёна.
Стэфану Н. з Полацкага раёна.

# Адносіны дайшлі да коскі

«Трэба было б майму калегу ўсё–такі некаторыя рэчы дагаворваць. У іх ёсць такая, вы ведаеце, звычка пасля коскі не сказаць, што было далей».



### «Расійскі калега нядобрасумленна вырывае пэўныя рэчы»

У часе паездкі на Смалявіччыну кіраўнік Беларусі раскрытыкаваў нядаўнюю заяву Дзмітрыя Мядзведзева пра тое, што Лукашэнка абяцаў прызнаць незалежнасць Абхазіі і Паўднёвай Асеціі.

«Я не хацеў дыскутаваць на гэтую тэму, проста расійскі калега нядобрасумленна і непрыстойна вырывае пэўныя рэчы», — сказаў Лукашэнка.

«Ён толькі не сказаў другую частку, калі я яму сказаў: не праблема для Беларусі прызнаць Асецію і Абхазію, і сёння не праблема. Але я яму пералічыў тыя праблемы, якія ў сувязі з гэтым узнікнуць у Беларусі. Вы згодныя, у Беларусі будуць праблемы па лініі Беларусь — ЕС, па лініі Беларусь — Амерыка, па лініі Беларусь — СНД і гэтак далей? Мы дакладна на працягу двух месяцаў працавалі над гэтымі праблемамі і іх вычленілі — іх было паўтара дзясятка прыкладна», — зазначыў Лукашэнка.

Паводле яго слоў, Расія «аказалася няздольнай або не захацела кіраўніцтва Расіі ісці на нівеляванне, на ліквідацыю тых наступстваў, якія для Беларусі павінны былі ўзнікнуць».

«Вось гэтага Мядзведзеў не сказаў. Таму трэба было б майму калегу ўсё-такі некаторыя рэчы дагаворваць. У іх ёсць такая, вы ведаеце, звычка пасля коскі не сказаць, што было далей», — мяркуе Лукашэнка.

### Тады АЭС пабудуюць не расіяне

Аляксандр Лукашэнка таксама спыніўся на пытанні пабудовы АЭС. «Калі Расія не будзе будаваць у нас атамную станцыю — а зараз ідуць гэтыя перамовы, — мы будзем дамаўляцца з іншымі інвестарамі. У свеце яны ёсць», — заявіў ён.

«Няхай мы крышку страцім час — не гарыць. Але мы суверэнная дзяржава, мы просім крэдыт, не танны крэдыт, мы за яго будзем будаваць атамную станцыю з іншымі дзяржавамі. Прапановы наконт гэтага ў нас ёсць», — сказаў беларускі кіраўнік.

### Рэакцыя Расіі: апублікуем стэнаграмы

Памочнік прэзідэнта РФ, Сяргей Прыходзька, праз некалькі гадзін пасля шчырых слоў Лукашэнкі адзначыў, што «не Аляксандру Рыгоравічу гаварыць тут пра непаслядоўнасць». «Гэтая катэгорыя скарыстаная якраз у адносінах да яго (Лукашэнкі)», — упэўнены Прыходзька.

«Што тычыцца пытання аб прызнанні Рэспублікай Беларусь Рэспублікі Паўднёвая Асецыя і Рэспублікі Абхазія, то, калі будзе такое жаданне, мы можам апублікаваць тую частку стэнаграмы пасяджэння АДКБ, у якой змяшчаюцца словы прэзідэнта Беларусі на гэтую тэму», — сказаў памочнік прэзідэнта Расіі.

«Можам апублікаваць і іншыя выказванні Аляксандра Лукашэнкі, якія будуць даволі цікавымі як беларускай, так і міжнароднай грамадскасці», — дадаў Прыходзька.

За 16 гадоў знаходжання ва ўладзе Лукашэнка мог нагаварыць самых розных рэчаў. Асабліва ў «вузкім коле».

### Мядзведзеў не хоча размаўляць з Лукашэнкам

Паводле інфармацыі расійскага выдання «Камерсант», на сустрэчы лідэраў краін АДКБ 20—21 жніўня ў Ерэване Дзмітры Мядзведзеў не мае намеру размаўляць з Аляксандрам Лукашэнкам. Зрэшты, беларускі лідэр туды ўсё ж ляціць

Той самы «Камерсант» паведамляе, што, магчыма, бліжэйшым часам Беларусь атрымае запрашэнне далучыцца да арганізацыі ГУАМ, якая аб'ядноўвае Грузію, Украіну, Азербайджан і Малдову. Нібыта такое развіццё падзей абмяркоўвалася ў Тбілісі падчас сустрэчы Міхаіла Саакашвілі з выконваючым абавязкі прэзідэнта Малдовы Міхая Гімпу. У Расіі гэты альянс лічаць накіраваным супраць Расіі.

Здаецца, што стасункі паміж лідэрамі двух краін дайшлі да кропкі незвароту.

**Зміцер Панкавец**

## Аляксандр Мілінкевіч: Па чужых сцэнарах не гуляю

Лідэр Руху «За Свабоду» адказвае пра магчымасць удзелу ў прэзідэнцкіх выбарах.

**«Наша Ніва»: Дык сапраўды можаце не ўдзельнічаць у выбарах?**

**Аляксандр Мілінкевіч:** Гэта будзе вырашацца пазней. Пакуль яшчэ і выбары не прызначылі. А размовы пра тое, што Мілінкевіч вагаецца ці не вызначыўся, заўчасныя. Зразумейце, мяне не цікавяць ні пасады, ні крэслы. Важна мець адказнасць за лёс краіны. Ісці на выбары з агульнай стратэгіяй іншай Беларусі.

**«НН»: Але праблемы насамрэч ёсць?**

**АМ:** Праблем шмат. Пакуль няма кантролю за падлікам галасоў, і выбараў няма. Адсутнічае еднасць унутры нацыянальных сілаў. Зараз па гэтым пытанні праводжу кансультацыі як унутры блока БНБ, так і па-за яго межамі. Вось гэта і ёсць праблемы.

**«НН»: А дамовіцца з БХД яшчэ магчыма?**

**АМ:** Калі ўсе будуць адказнымі, то магчыма. Гэта адпавядае інтарэсам краіны. Страчаны час, але яшчэ не згубленыя ўсе магчымасці. Яднанне будзе залежыць ад нас.

**«НН»: У «Хросным бацьку» не прапаноўвалі зняцца?**

**АМ:** Не, і, думаю, што не прапануюць.

**«НН»: А каб прапанавалі?**

**АМ:** Па чужых сцэнарах я не гуляю. Сцэнар павінен быць беларускім.

**«НН»: Колькі чалавек можа сабраць неабходныя для рэгістрацыі 100 тысяч подпісаў?**

**АМ:** Адзін ці максімум два апазіцыянеры. Для дасягнення такой мэты неабходна 3 тысячы чалавек, не менш. Бо частка не збірае, іншая не ўмее. Працуем у гэтым накірунку.

**Гутарыў ЗП**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## У 35-градусную спёку

200 чалавек выйшлі на акцыю памяці зніклых палітыкаў і журналістаў.

Мінгарвыканкам забараніў правядзенне вулічнай акцыі 16 жніўня. У адказе гаварылася, што проста заяўка была пададзена неналежным чынам.

Тым не менш, вырашылі, што акцыя ўсё адно адбудзецца. Толькі адмовіліся ад шэсця. Меркавалася, што яно адбудзецца ад Акадэміі навук да Пляца Волі.

Старшыня АГП Анатоль Лябедзька зазначыў, што ёсць два рашэнні Вярхоўнага суда, дзе адзначаецца, што стаянне з партрэтамі зніклых не падпадае пад дзеянне законаў аб масавых акцыях. «Ніхто парушаць заканадаўства не будзе», — сказаў А.Лябедзька.

Едучы на акцыю, сустрэў у метро Уладзіміра Някляева. Разгаварыліся з лідэрам кампаніі «Гавары праўду», калі выходзілі да Акадэміі навук. Яшчэ ў пераходзе да мяне падбег кароткастрыжаны хлопец, які прапанаваў прайсці за ім. Някляева ніхто не чапаў.

Завялі ў апарняк, што знаходзіцца на станцыі. Хлопец у цывільным пайшоў правяраць нашы дакументы. Праўда, нядоўга. Хвіліны праз тры пераканаўся, што насамрэч журналіст, пасля чаго адпусціў.

Уласна на акцыю прыйшло каля 200 чалавек, што для такога спякотнага надвор'я зусім нямала. Кожны трымаў у руках партрэт зніклых. Людзі сталі ланцугом уздоўж праспекта, каб іх маглі бачыць машыны.

Афіцэры з прэс-службы хадзілі з мегафонамі, заклікаючы разыходзіцца. Але ўжываць фізічную сілу супраць дэманстрантаў не адважыліся.

Толькі ўжо калі ўдзельнікі разыходзіліся, то паспрабавалі затрымаць двух арганізатараў — Яўгена Афнагеля і Паўла Юхневіча. Першага хутка закінулі ў міліцэйскі аўтобусік, а вось другога атрымалася адбіць. Праўда, ненадоўга. Калі людзі ўжо разышліся, то Юхневіча затрымалі таксама.

Адвезлі іх у Партызанскі РУУС. Але ў скорасці выпусцілі, нават без пратаколаў.

**ЗП**

## Рэйтынг Лукашэнкі падае

Сталі вядомыя вынікі ліпеньскага сацыялагічнага апытання, якое ў Беларусі правяла кампаніі Baltic Surveys.

Вынікі паказваюць, што рэйтынг Лукашэнкі працягвае зніжацца.

Беларускім рэспандэнтам задавалі простае пытанне: «Калі б у найбліжэйшы час адбыліся новыя выбары прэзідэнта РБ, за каго б вы прагаласавалі ў першую чаргу?». Колькасць тых, хто гатовы падтрымаць Аляксандра Лукашэнку, падае.

Зніжэнне пазітыўнага прэзідэнцкага рэйтынгу цягнецца з мая. Калі ў красавіку 39% апытаных гатовыя былі падтрымаць прэзідэнта на блізкіх прэзідэнцкіх выбарах, то да ліпеня гэтая лічба знізілася да 33 працэнтаў.

Пры гэтым на пытанне: «Каго б вы катэгарычна не падтрымалі або выступілі супраць, 12,1% апытаных назвалі Лукашэнку.

Негатыўны рэйтынг кіраўніка дзяржавы расце. У чэрвені 10,5% апытаных збіраліся адназначна галасаваць супраць Аляксандра Лукашэнкі.

Цікава будзе паглядзець на дадзеныя рэйтынгу за жнівень. Менавіта ў ліпені пачалася шырокая кампанія ў расійскіх СМІ з крытыкай палітыкі прэзыдэнта Лукашэнкі. Таксама ў ліпені выйшлі дзве серыі скандальнага фільма НТВ «Хросны Бацька». Усё гэта не магло не адбіцца на рэйтынгу Лукашэнкі.

**Belaruspartisan.org**

### Кастусёў: Мая кампанія будзе фінансавацца толькі з беларускіх крыніцаў

Кандыдат у прэзідэнты ад Партыі БНФ Рыгор Кастусёў заявіў, што ягоная агітацыйная кампанія будзе весціся без прыцягнення замежных сродкаў.

Па словах Кастусёва, гэтым кампанія кандыдата ад Партыі БНФ будзе адрозніваца ад кампаніяў усіх іншых прэтэндэнтаў на пасаду кіраўніка дзяржавы.

«Фінансаванне палітычнай кампаніі за замежныя грошы несумяшчальнае з інтарэсамі беларускага народа», — заявіў Рыгор Кастусёў, вылучаны Партыяй БНФ у прэзідэнты. «Мы не шукаем замежных «палітычных інвестыцыяў», каб не страціць самастойнасць у сваёй дзейнасці. Мая кампанія на ўсіх стадыях будзе весціся выключна за айчынныя сродкі, толькі за кошт беларускіх крыніцаў фінансавання. Гэта будзе на 100% беларуская кампанія», — адзначыў прэтэндэнт ад Партыі БНФ.

**ЗП**

### Сцісла

• **Перастаноўкі ў войску.** 16 жніўня кіраўнік Беларусі Аляксандр Лукашэнка зрабіў шэраг кадравых прызначэнняў ва Узброеных сілах. Камандуючым войскамі Заходняга аператыўнага камандавання прызначаны Сяргей Патапенка. Раней гэтую пасаду займаў Аляксандр Мяжуеў. Ён стаў начальнікам галоўнай ваеннай інспекцыі Узброеных сіл. На гэтай пасадзе ён змяніў Генадзя Шаўрова, які выйшаў у адстаўку па хваробе ў красавіку гэтага года.

• **Міністр культуры Павал Латушка сустрэўся са старшынёй Таварыства аховы помнікаў Антонам Астаповічам.** Гэта ўжо трэцяя сустрэча міністра з лідэрам грамадскае арганізацыі, якая займаецца абаронай спадчыны.

• **Сакратар Сойма Латвіі раскрытыкаваў нацыянальную палітыку Беларусі.** Каментуючы выданню Neatkarigas Rita Avize намер увесці ў Латвіі аплачваную дзяржавай адукацыю толькі на латвійскай мове, сакратар Сейма Дзінтарс Расначс раскрытыкаваў нацыянальную палітыку Беларусі. «Мы не хочам апынуцца ў сітуацыі, у якой цяпер знаходзіцца Беларусь. Там беларускую мову ведае 80% насельніцтва, а выкарыстоўвае толькі 20%. Беларуская мова знікае, саступаючы месца расійскай. Для нас гэты шлях не хуткі, але, на жаль, мы таксама па ім ідзём».

**ЗП**

# Беларусь зацікавіла толькі аднаго ўкраінскага мільянера

Бізнэс паўднёвай суседкі прадстаўлены ў нашай краіне слаба.

Расія, Польшча, Літва... Прадпрымальнікі кожнай з суседніх краін разглядаюць Беларусь не толькі як рынак збыту сваіх тавараў. Гэта яшчэ і патэнцыйнае месца для размяшчэння вытворчасці. Здаецца, так мяркуюць усе суседзі, апроч украінцаў.

Хоць Украіна застаецца чацвёртым партнёрам нашай краіны па аб'ёмах гандлю, за мінулы год колькасць інвестыцый у Беларусь з паўднёвага боку ледзь перавысіла $2 мільёны!

На ўсе шэсць свабодных эканамічных зонаў Беларусі зарэгістравана ўсяго тры сумесныя ўкраінска-беларускія прадпрыемствы. У Мінску — кабельны завод і мэблевы цэх. У Гомелі ж у пачатку года запрацавала вытворчасць меднай катанкі, у якую ўкраінцы гатовыя інвеставаць 4,3 млн еўра.

Сумесны бізнэс ахвотней размяшчаецца на тэрыторыі Украіны. Напрыклад, у 2009 годзе былі зарэгістраваныя чатыры новыя прадпрыемствы — і ніводнае з іх не базуецца ў нашай краіне. Статыстыку забяспечваюць кампаніі накшталт «Белрэсурсаў» і «Белпрадзабеспячэння», якія пашыраюць сферу ўплыву ў паўночнай Украіне. Дарэчы, за іх кошт экспарт беларускіх тавараў нават перавышае імпарт.

Між іншым, кіруючыя пасады ў сумесным праекце з украінцамі зафіксаваныя ў біяграфіі кандыдата ў прэзідэнты ад Партыі БНФ Рыгора Кастусёва. У 2002—2004 гг. ён быў дырэктарам магілёўскай кампаніі «Гідрасіла — Белая Русь».

### В.а. мільярдэраў

Украінскія алігархі Беларуссю не цікавяцца, і з гэтым фактам можна змірыцца. Данбаскія металісты і сталявары захопленыя іншымі аб'ёмамі прыбытку, чым можна атрымаць з нашых прадпрыемстваў.

Адзінае, што сваю даччыную кампанію мае «Украінская горна-металургічная кампанія», якой валодаюць трое мільярдэраў — Віталь Гайдук, Алег Мкртчан і Сяргей Тарута.

Роля самага актыўнага ўкраінца ў беларускім бізнэсе належыць 37-гадоваму мільянеру Мікалаю Лагуну. Маючы ва ўласнасці каля $90 мільёнаў, у сябе на радзіме ён ледзь-ледзь трапляе ў лік 100 найбагацейшых людзей краіны, а вось у Беларусі валодае шэрагам разнастайных кампаній.

У нашу краіну ён прыйшоў у 2007 годзе, калі купіў за $680 тысяч «Атамбанк», які быў на мяжы банкруцтва, і перайменаваў яго ў «Дэльта». У наступным годзе ягоныя інтарэсы перайшлі на страхавы рынак Беларусі. Тады Лагун купіў кампанію «Бенір» — цяпер гэта «Дэльта-страхаванне». Яму ж належаць і харчовыя ўніверсамы з сеткі «Родная старонка» («Родная старонка»), якія пакуль што ахапілі Мінск, Брэст, Гомель, Ліду і Салігорск.



Украінец Мікалай Лагун валодае ў Беларусі «Дэльтабанкам».

### Цігіпка не дайшоў да Беларусі

Цікава, што свой банк у Беларусі хацеў займець яшчэ адзін украінец, Сяргей Цігіпка. Удзельнік прэзідэнцкай гонкі-2010, які заняў трэцяе месца на выбарах, два гады таму падаваў дакументы на стварэнне «Т-Банка», але не давёў справу да канца.

Астатнія ўкраінскія багацеі звязаныя з Беларуссю не наўпрост. Напрыклад, у 2008 годзе чэшскі чыгуначны перавозчык OKD выкупіў за $3,65 мільёна закансерваваную базу Міністэрства абароны Беларусі пад Брэстам. У савецкія часы праз яе прымаліся грузы. З тымі ж мэтамі на яе закінутых пляцоўках створана кампанія «Белтэрмінал». Уся група прадпрыемстваў належыць нідэрландскаму горнаму холдынгу, адным з кіраўнікоў якога з'яўляецца ўкраінскі мільярдэр Канстанцін Жывага.

### Перспектывы

Украінская кампанія «Плазма-Тэк» уже ўклала больш за $600 тысяч у развіццё Светлагорскага завода зварачных электродаў.

У Гомелі плануецца стварыць сумеснае прадпрыемства па выпуску вагонаў павышанай камфортнасці.

**Яўген Васількоў**



Сайт resurs.by выявіў чарговы факт «імпартазамяшчэння па-беларуску». Як сцвярджае аўтар допісу на сайт, у маніторах беларускай вытворчасці Summit Systems беларускай аказалася толькі налепка. Нутро ж у іх кітайскае. Затое прадаюцца даражэй, бо «купляй сваё».

## Расійскі алігарх збудуе ў Беларусі завод

Урад Беларусі са спазненнем, але ўсё ж падпісаў інвестыцыйную дамову з Брынцалавым.

Расійскі мільярдэр пабудуе ў Беларусі фармацэўтычны завод, паведамляе «Ежедневник».

Паводле звестак выдання, у лістападзе 2009 года А.Лукашэнка падпісаў загад пра перадачу СААТ «Ферэйн», якое належыць Уладзіміру Брынцалаву, фармацэўтычнага прадпрыемства «Дыялек» з наступным будаўніцтвам на яго тэрыторыі новага завода. Адначасова «Дыялеку», які перадаваўся Брынцалаву як маёмасны комплекс, спісваліся ўсе запазычанасці перад бюджэтам. Наўзамен беларуская дзяржава мае атрымаць 25% акцый + 1 акцыю СААТ «Ферэйн».

Кіраўніку Беларусі вельмі спадабаліся планы Брынцалава, асабліва ў справе вытворчасці антыбіётыкаў, што меліся цалкам замяніць дарагія імпартныя аналагі, маркуе «Беларускі партызан». Менавіта таму бізнэсоўцу было дадзенае зялёнае святло ва ўсіх яго пачынаннях.

Брынцалаў ужо даўно і працуе, і жыве ў Мінску, маючы толькі расейскае грамадзянства.

Першапачаткова новы завод планавалі збудаваць да 2015 года. Ён паўстане на плошчы ў 6 тыс. кв. метраў. Брынцалаў закупіў для яго абсталяванне на 30 млн даляраў. Цяпер ідзе рэгістрацыя каля 150—200 найменняў лекавых сродкаў, якія мае выпускаць «Ферэйн» у Беларусі. Брынцалаву паставілі ўмову, што сярод іх не мае быць такіх, якія выпускаюцца беларускімі заводамі.

У Расіі прадпрыемства алігарха і кандыдата ў прэзідэнты 1996 года Уладзіміра Брынцалава мела скандалы з фальсіфікатамі лекаў.

**Сяргей Мікулевіч**

### Сцісла

**• Лукашэнка едзе ў Іран пускаць нафту.** У кастрычніку кіраўнік Беларусі наведае Іран і, магчыма, возьме ўдзел у адкрыцці радовішча Джафейр. Радовішча залягае на мяжы Ірана з Іракам, за 70 км на паўднёвы захад ад горада Ахваз. Кантракт пра яго распрацоўку яшчэ ў 2007 годзе падпісалі «Беларуснафта» і Нацыянальная нафтавая кампанія Ірана. Запасы Джафейра ацэньваюцца ў 2,1 млрд барэляў. Магутнасць пласта дазваляе здабываць 25 тысяч барэляў у суткі.

**• Адмоўнае сальда замежнага гандлю за паўгода склала амаль $2,4 млрд.** Па выніках студзеня—чэрвеня 2010 склалася адмоўнае сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі па метадалогіі плацежнага балансу і склала 2 млрд 390,8 млн даляраў. Аб'ём знешняга гандлю таварамі і паслугамі ў студзені—чэрвені склаў 29 млрд 153,6 млн даляраў, што на 19,6% больш, чым за такі ж перыяд 2009. У тым ліку экспарт — 13 млрд 381,4 млн (на 25,5% больш), імпарт — 15 млрд 772,2 млн (на 15,1% больш). Па метадалогіі гандлёвага балансу, які ўлічвае звесткі Дзяржаўнага мытнага камітэта, у студзені—чэрвені адмоўнае сальда знешняга гандлю таварамі сфармавалася ў памеры 3 млрд 510 млн даляраў.

**• Сёлета ЕБРР не будзе фінансаваць Беларусь.** Хаця мінулы год быў адзначаны рэкорднай актыўнасцю ў гісторыі ўзаемаадносінаў Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця і Беларусі. Гэта, у прыватнасці, вылучэнне сродкаў «Белгазпрамбанку» і Мінскаму транзітнаму банку для фінансавання малога бізнэсу, крэдыт «Пінскдрэву», а таксама набыццё ЕБРР 25% акцыяў у сетцы крамаў дзіцячай вопраткі «Буслік». Але за студзень—ліпень 2010 года ЕБРР не ўхваліў ніводнага беларускага праекта.

**• Белстат: У нафтаперапрацоўцы спад вытворчасці на 29,9%.** У студзені—ліпені 2010 года падзенне вытворчасці адзначана ў нафтаперапрацоўцы і станкабудаванні. Аб'ём вытворчасці ў нафтаперапрацоўчай прамысловасці зменшыўся на 29,9% у параўнанні з гэткім жа перыядам 2009 года, у станкабудаўнічай і інструментальнай — на 9%. Падзенне аб'ёмаў вытворчасці адбылося ў цэлым у паліўнай прамысловасці (на 23,8%), у тым ліку ў нафтаздабыўной — на 1,1%.

**• 7 млн тон збожжа замест прагназаваных 9.** Беларусь плануе сёлета сабраць каля 7 млн тон збожжа ў свірнавай вазе і каля мільёна тон кукурузы, заявіў міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Міхаіл Русы. На што А. Лукашэнка сказаў: «А абяцаў 9 мільёнаў тон. Вось твой пачатак працы».

**• Беларусь змяніла расійскую вакцыну на кітайскую.** Сёлета жыхароў Беларусі ад грыпу будуць прышчапляць вакцынай кітайскай вытворчасці. Тэндэр выйграла не расійская, а кітайская вакцына. Усяго яе закупяць каля 1,4 мільёна доз. Цягам апошніх гадоў Беларусь закупляла расійскую вакцыну супраць грыпу.

**• Нацбанк зніжае стаўку рэфінансавання да 11%.** Стаўка рэфінансавання Нацыянальнага банка з 18 жніўня будзе зніжана яшчэ на 0,5 працэнтнага пункта і складзе 11 % гадавых.

**СМ**

# КДБ працягвае помсціць Камітэту дзяржкантролю

**Дзяржбяспека арыштавала галоўнага следчага КДК Дзмітрыя Адамовіча.**

Пра гэта паведаміла інтэрнэт-газета «Ежедневник», якая мае крыніцы інфармацыі ў КДБ. Газета піша, што амаль адначасова ад займанай пасады быў адхілены памочнік старшыні КДК Віктар Пісарык.

Пасля праверкі Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК, праведзенай Радай бяспекі, дзяржкантроль больш за месяц чакаў разгрому. І вось гром грымнуў.

Як пісалі крыніцы, блізкія да КДБ, падчас той праверкі былі выяўленыя схемы, па якіх бізнэсоўцы быццам бы ўнікалі крымінальнага пераследу. Прычым цэнтральнай фігурай па многіх эпізодах такіх схем нібыта праходзіў менавіта арыштаваны цяпер начальнік Упраўлення па расследаванні злачынстваў ДФР КДК.

Схемы працавалі дастаткова проста: расследаванне крымінальнай справы прыпынялася на якой-небудзь добрапрыстойнай падставе (напрыклад, у сувязі з вышукам падазраваных, якія нікуды не хаваліся), а потым пра яго забываліся на 5, 6 або 9 гадоў, пакуль не канчаўся тэрмін прыцягнення да крымінальнай адказнасці або пакуль адпаведны артыкул не выключаўся з Крымінальнага кодэкса.

Пасля таго як пра вынікі праверкі даклалі кіраўніцтву краіны, пачалася аператыўная распрацоўка органаў фінансавых расследаванняў Беларусі з боку Камітэта дзяржаўнай бяспекі. Як мяркуе «Ежедневник», яна была скіраваная супраць дарадцы старшыні КДК Віктара Пісарыка, намесніка дырэктара ДФР КДК Віктара Марозава і начальніка Упраўлення расследавання злачынстваў ДФР КДК Дзмітрыя Адамовіча.

Пра Пісарыка кажуць, што менавіта ён рэальна кіруе Камітэтам дзяржкантролю, хоць фармальна з'яўляецца ўсяго толькі дарадцам старшыні.

Пісарык у свой час пралабіраваў прызначэнне на пасаду намесніка дырэктара ДФР КДК Віктара Марозава, які цалкам змяніў структуру следства органаў фінансавых расследаванняў.

Спачатку тэрытарыяльнае следства органаў фінансавых расследаванняў было выведзенае з-пад непасрэднага падпарадкавання цэнтральнага следчага ўпраўлення ДФР КДК, і, каб яшчэ больш узмацніць кантроль над следствам, у дэпартаменце ствараецца Упраўленне працэсуальнага нагляду.

На пасады начальнікаў следчага і наглядчага ўпраўленняў Віктар Марозаў ставіць сваіх людзей — двух блізкіх сяброў, якіх наўпрост падпарадкоўвае сабе. Пры гэтым у следчым упраўленні быў створаны яшчэ адзін аддзел, які падмяў пад сябе ўсе расследаванні фінансавых злачынстваў, дзе фігуравалі буйныя сумы. А кіраваць аддзелам, як сцвярджае «Ежедневник», Віктар Марозаў прызначыў свайго хрэсніка. Такім чынам ён замкнуў на сабе і следства, і кантроль над ім у ДФР КДК. У сваю чаргу Віктар Марозаў наўпрост замыкаўся і знаходзіўся ў блізкіх сяброўскіх адносінах з Віктарам Пісарыкам, які забяспечваў яму прыхільнасць старшыні КДК Зянона Ломаця.

Гэтая схема была прынятая ў КДБ за працоўную, таму, каб пачаць распрацоўку «святой тройцы», у першую чаргу было ініцыяванае адхіленне ад пасады Віктара Пісарыка.



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Дзмітрый Адамовіч.**

Паводле інфармацыі «Ежедневника», на мінулым тыдні чэкісты правялі ў дачыненні да ДФР КДК супрацькарупцыйную аперацыю, як у самым сапраўдным дэтэктыве.

Нехта з арыштаваных даў паказанні супраць начальніка Упраўлення па расследаванні злачынстваў ДФР КДК Дзмітрыя Адамовіча.

У аўторак, 3 жніўня, Дзмітрыя Адамовіча папрасілі прыехаць у КДБ — нібыта каб узгадніць пазіцыі па адной сумеснай аператыўнай распрацоўцы. Адамовіч так і сказаў падначаленым, што едзе ў КДБ. Больш яго ніхто не бачыў.

Як расказалі ў Камітэце дзяржбяспекі, першапачаткова Адамовіч сапраўды паехаў да КДБ, але па дарозе нечакана перадумаў. Ён раптам накіраваўся ў Генеральную пракуратуру. Але чэкісты перахапілі галоўнага фінансавага следчага Беларусі проста на ганку пракуратуры.

Дзмітрый Адамовіч аказаў актыўны супраціў аператыўнікам КДБ, але яго скруцілі, запіхнулі ў машыну і звезлі. Усё гэта назіралі са сваіх вокнаў пракурорскія работнікі.

У пятніцу чэкісты прыйшлі да намесніка генеральнага пракурора Мікалая Купліса па санкцыю на арышт Адамовіча. Трэба меркаваць, зусім невыпадкова, бо старшыня КДБ сёння сам можа даваць такую санкцыю. Але чэкісты пайшлі не да яго, а да Купліса, таму што да яго пасля затрымання галоўнага фінансавага следчага Беларусі тры дні хадзілі пасланцы ад старой марозаўскай гвардыі ДФР КДК. Вось чэкісты, напэўна, і хацелі паглядзець, як будзе паводзіцца намеснік генеральнага пракурора. Чэкісты праседзелі ў Купліса дзве гадзіны, але так і не атрымалі санкцыі на арышт Адамовіча. Пасля гэтага санкцыю на арышт даў старшыня КДБ Вадзім Зайцаў.

Цяпер КДБ рыхтуе даклад для кіраўніка дзяржавы, у якім не толькі апісваюцца ўсе гэтыя падзеі, але і даюцца ацэнкі дзейнасці як арыштаванага Адамовіча, яго непасрэднага начальніка Віктара Марозава, іншых людзей з іх каманды, так і намесніка генеральнага пракурора Мікалая Купліса.

Ані КДБ, ані КДК інфармацыі пра справу не даюць.

**СГ; Паводле ej.by**

# Магазін «Савецкі», кілбаса «Калядная»

**Беларускі бізнес не саромеецца эксплуатаваць настальгію па савецкім мінулым. Аднак маркетолагі перасцерагаюць — засталося нядоўга.**

Гарэлка «СССР», майкі з савецкім гербам, марожанае «28 капеек», вагон-рэстаран у цягніку Гродна—Масква, аформлены ў стылі савецкай эпохі, — з сімволікай савецкага часу мы сутыкаемся кожны дзень.

Частка грамадства выступае катэгарычна супраць яе ўжывання, нагадваючы пра рэпрэсіі і паднявольны стан Беларусі ў бальшавіцкай імперыі. У суседніх краінах савецкія сімвалы забароненыя на афіцыйным узроўні. Тым не менш, у Беларусі дагэтуль не лічыцца заганным выкарыстоўваць настальгію па нядаўнім мінулым, а некаторыя прадпрымальныя людзі робяць на гэтым нішавы бізнес.




СЯМЁН ПЕЧАНКА

### «Савецкі», бо якасна і танна

Магазін «Савецкі» з'явіўся ў Мінску паўгода таму. Гэта чатыры мясныя крамы, якія належаць ТАА «Савецкі век».

Чаму «Савецкі»? Дырэктар прадпрыемства Дзмітры Свірыдаў тлумачыць: «Мы спрабуем рабіць прадукцыю, якую многія памятаюць з тых недалёкіх часоў». Спадар Дзмітры прызнаецца, што назва крамаў пакуль не асабліва спрыяе бізнесу.

Пры бліжэйшым разглядзе выявілася, што савецкая ў тых крамах хіба толькі назва. Асартымент далёка не савецкі, у інтэр'еры і абсталяванні і намёку няма на стылізацыю пад чырвонае мінулае. Пра тое, што гэта ўсяго толькі бізнес, гавораць назвы кілбасаў — «Святочная», «Калядная», «Элітная».

### «Стары кліент адыходзіць»

Кіраўнік партала Marketing.by Сяргей Скараход мяркуе, што бізнес, цалкам выбудаваны на эксплуатацыі настальгіі па мінулым, не мае доўгатэрміновай перспектывы. «Пакаленне, якое настальгуе па Савецкім Саюзе, незваротна сыходзіць». Акрамя таго, гэта катэгорыя пакупнікоў адносіцца да самай кансерватыўнай. Найбольш жа перспектыўная для прадаўца — генерацыя 18—33-гадовых, большасць з якіх не мае сантыментаў да савецкага.

**Сямён Печанко**

## Сцісла

**• Сакратар Сойма Латвіі: «Беларусь першай знікне з еўрапейскай мапы нацыянальных дзяржаваў».** Каментуючы выданню «Neatkarigas rita avize» намер увесці ў Латвіі аплачваемую дзяржавай адукацыю толькі на дзяржаўнай мове, сакратар Сойма Дзінтарс Раснач спасылаўся на нацыянальную палітыку Беларусі. «Мы не хочам апынуцца ў сітуацыі, у якой цяпер знаходзіцца Беларусь. Гэта дзяржава, якая першай знікне з еўрапейскай мапы нацыянальных дзяржаваў. Там беларускую мову ведае 80% насельніцтва, а выкарыстоўвае толькі 20%. Пакуль будзе жывая латышская мова — будзе жывая і латвійская дзяржава. Калі мы нічога не будзем рабіць, нас чакае шлях Беларусі — будзе вялікі наплыў гастарбайтараў».

**• Царква «Новае жыццё» рашыла не падпарадкоўвацца пастанове суда.** 8 жніўня, на нядзельным служэнні, адбылося галасаванне ўсіх вернікаў, ці далей абскарджваць рашэнне, ці не. Такім чынам, 14 жніўня рашэнне ўступіць у «законную» сілу. Суд прысудзіў царкве амаль 250 млн рублёў штрафу, нібыта за шкоду экалогіі, нанесеную будаўніцтвам царквы. Націск на царкву пачаўся пасля таго, як у 2006-м яе пастары заклікалі не галасаваць за Лукашэнку, бо не бачылі на ім Божага блаславення.

**• Чыноўнікі будуць абавязаныя адказваць на пісьмовыя звароты па-беларуску.** Такая норма прадугледжваецца новым законапраектам аб зваротах. Аб гэтым паведаміў «Звяздзе» дэпутат палаты прадстаўнікоў Яўген Мельнікаў.

**• Кіраўнік УП «Брэстаблсаюздрук» Васіль Марэйка ў аднабаковым парадку на дзве трацiны знізіў замову тыражу газеты «Брэсцкі кур'ер».** Па словах рэдактара выдання, такім чынам калектыў газеты караюць за пошук альтэрнатыўных шляхоў распаўсюду выдання.

**МБ**

# Станцыя метро «Плошча Леніна» не стане «Плошчай Незалежнасці»?




Перайменаванне станцыі метро «Плошча Леніна» ў «Плошчу Незалежнасці» будзе чарговы раз разглядацца ў Мінгарвыканкаме ў верасні. Аб гэтым паведаміла начальнік аддзела культурна-асветнай працы Упраўлення культуры Мінгарвыканкама Вольга Лукашук.

15 сакавіка Камісія па найменаванні і перайменаванні вуліц пры Мінгарвыканкаме прыняла рашэнне аб перайменаванні шэрагу сталічных артэрый. Гэтак, вуліца Герцэна павінна была стаць Бернардынскай, Дзімітрава — Пятніцкай, Рэвалюцыйная — Койданаўскай, Вызвалення — Уваскрасенскай, Камунальная ўзбярэжная — Траецкай узбярэжнай. Апроч таго, станцыя метро «Плошча Леніна» мусіла атрымаць назву «Плошча Незалежнасці», якую ўжо насіла з 1992 па 2003 год.

Па словах Вольгі Лукашук, да іх прыйшло шмат водгукаў ад мінчукоў — як станоўчых, гэтак і адмоўных.

«Ветэранскія арганізацыі супраць», — адзначыла чыноўніца.

**Tut.by**

# Абяцанкі-цацанкі

**Юбілей Караткевіча: помнікаў не паставілі, фільмаў не знялі, выданні — у планах.**

У пачатку года Міністэрства культуры з помпай распаўсюдзіла спіс урачыстасцяў у гонар 80-годдзя пісьменніка, рамантыка нацыянальнага адраджэння. Да свята Караткевіча застаецца тры месяцы, а рэалізацыя ўсё большай колькасці мерапрыемстваў адсоўваецца на 2011 год. Або на свяце ніколі.

Найперш праблемы ўзніклі з помнікамі пісьменніку. Заяўлялася, што яны могуць паўстаць у Кіеве, Мінску і Рагачове. Ставіць помнік ва ўкраінскай сталіцы, дзе пісьменнік вучыўся ва ўніверсітэце, даручыў асабіста Аляксандр Лукашэнка. Таму і ўвага да гэтага праекта большая. І тым не менш, яго адкрыццё адбудзецца хіба ў наступным годзе. Пра гэта паведаміў намеснік міністра культуры Беларусі Віктар Кураш. Па яго словах, беларускія архітэктары яшчэ працуюць з кіеўскімі ўладамі, вырашаючы арганізацыйныя пытанні.

На помнік у Мінску грошай няма (фінансуецца ў першую чаргу кіеўскі праект). Магчыма, на наступны год, адзначылі ў Мінкультуры.

У Рагачове, дзе Караткевіч напісаў не адзін свой твор, планавалі паставіць помнік герою аповесці «Ладдзя Роспачы» Гервасію Выліваху. Як адзначыла старшыня Рагачоўскага райсавета дэпутатаў Рыма Ястрэмская, сёлета помнік не з'явіцца. Яшчэ ідзе абмеркаванне прапанаваных эскізаў. Але падарунак для нашчадкаў пісьменніка ўсё-такі ў Рагачове зрабілі: мясцовыя ўлады прынялі рашэнне аб перайменаванні вуліцы Чкалава ў Караткевіча. Тут знаходзіцца хата яго дзядзькі.

Аб грандыёзных праектах заяўлялі і «Беларусьфільм», і тэлерадыёкампанія «саюзнай дзяржавы». Айчынная кінастудыя бралася за здымкі 4-серыйнага мастацкага фільма па рамане «Каласы пад сярпом тваім», а старшыня тэлерадыёвяшчальнай арганізацыі «саюзнай дзяржавы» Ігар Угольнік летась паведаміў аб жаданні зняць стужку па матывах рамана «Чорны замак Альшанскі». Ён нават адзначаў, што і сцэнар рыхтуецца.

Аднак на «Беларусьфільме» пакуль працу не пачалі. Не вызначыліся з акцёрамі і рэжысёрам. Пасля таго, як у маі галоўны рэжысёр Купалаўскага тэатра Мікалай Пінігін адмовіўся ад супрацы, яму ўсё яшчэ шукаюць замену.

Амбітны праект прапаноўвалі і Мінкультуры з Мініфармацыі — выданне твораў класіка на замежных мовах, якія пры спрыянні Міністэрства замежных спраў і дыпламатычных установаў за мяжой меркавалася прэзентаваць у сталіцах шэрагу краін. Але і тут няма ладу. Намеснік міністра інфармацыі Ігар Лапцёнак паведаміў, што пакуль «ёсць толькі такая ідэя». Па яго словах, для пачатку павінен быць распрацаваны праект, затым трэба знайсці добрых перакладчыкаў, а калі выданне непрыбытковае, то яшчэ і фінансы. Гэта азначае, што ніхто пытаннем не займаецца. І можна гаварыць аб тым, што пасля юбілею пісьменніка знікне нават сама ідэя.




У выдавецтве «Мастацкая літаратура» запланаваны выхад Поўнага збору твораў Уладзіміра Караткевіча. Але і гэтае выданне разлічана пачаць толькі з наступнага года.

Нагадаем, што Мінгарвыканкам яшчэ меў намер паставіць у сталіцы білборды з партрэтамі пісьменніка. Рэалізацыя гэтага праекта, трэба меркаваць, пачнецца не раней за кастрычнік-лістапад. Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі прадугледжаны выпуск канверта з арыгінальнай маркай, памятнае гашэнне якой пройдзе ў Оршы.

Да юбілею пісьменніка ладзяцца мерапрыемствы, але гэта найчасцей заслуга не ўсёмагутнай дзяржавы, а прыватных асобаў і суполак. Зміцер Вайцюшкевіч, напрыклад, прысвяціў Уладзіміру Караткевічу свой канцэрт. А «нефарматныя» музыкі шукаюць сродкі для выпуску супольнага праекта песень на словы Уладзіміра Караткевіча «Скрыпка дрыгвы».

**Сяргей Макарэвіч**

КРЫМІНАЛ

# Адшукалі пад іншым прозвішчам

**Падазраванага ў махлярстве арыштавалі нават пасля таго, як ён змяніў грамадзянства і імя.**

Колішні бізнэсовец і грамадзянін Беларусі Ігар Станкевіч сёння мае імя Гары Шыед, не мае ніякага грамадзянства і адбывае тэрмін у магілёўскай турме.

Гісторыя пачалася ў сярэдзіне 1990-х. 25-гадовы Станкевіч вырашыў заняцца бізнэсам. Дзікі рынак спакушаў кожнага. Фірма «Аўтатэкс», у кіраўніцтва якой уваходзіў спадар Станкевіч, займалася галоўным чынам нерухомасцю. Як акажацца праз 10 гадоў — абыходзячы заканадаўства.

Як бы там ні было, у жніўні 1995-га Станкевіч разарваў свае адносіны з кампаніяй і з'ехаў з краіны на ПМЖ у Чэхію. Фірма працягвала дзейнасць. А І.Станкевіч тым часам ажаніўся з грамадзянкай Чэхіі, змяніў прозвішча, займеў сталы адрас у Празе і стаў шараговым супрацоўнікам адной з тысяч пражскіх турыстычных фірм. Дазвол на жыхарства і працу пазбаўляў неабходнасці аформіць грамадзянства, аб чым Ігар Станкевіч (а цяпер ужо Гары Шыед) пазней неадназоава пашкадуе.

У той жа час у 1998 годзе ён выйшаў з беларускага грамадзянства. У беларускім пасольстве ў Празе ў яго забралі беларускі пашпарт. Юрыдычна з таго моманту грамадзянін Беларусі Ігар Станкевіч перастаў існаваць. А на яго месцы з'явілася асоба без грамадзянства Гары Шыед, які працягваў наведваць сваякоў у Беларусі, перасякаючы мяжу з чэшскімі дакументамі і афіцыйна рэгіструючыся ў органах унутраных спраў Мінгарвыканкама.

А ў 2005 годзе Гары Шыед быў затрыманы ў аэрапорце Кіева. Яму паведамілі, што ён з'яўляецца грамадзянінам Беларусі Ігарам Станкевічам і знаходзіцца ў міжнародным вышуку ад 1996 года. Затым перадалі Беларусі. А праз год Першамайскі суд Мінска асудзіў яго на 8 гадоў пазбаўлення волі за махлярства ў асабліва буйным памеры, здзейсненае групай асобаў.

Як аказалася, крымінальная справа па факце злачыннай дзейнасці кіраўнікоў фірмы «Аўтатэкс» была распачатая яшчэ ў 1996 годзе. Тады ж Ігар Станкевіч быў пададзены ў вышук па лініі Інтэрпала. Якім чынам яго змаглі пазбавіць грамадзянства ў 1998 годзе, застаецца загадкай. Як і тое, як яму ўдавалася неаднаразова наведваць краіну.

Былога прадпрымальніка асудзілі як Ігара Станкевіча, хоць ён не меў ніякіх дакументаў на гэтае імя. Станкевічам ён доўгі час заставаўся і ў калоніі, пакуль, дзякуючы настойлівасці яго маці, якая адправіла не адну сотню лістоў у розныя інстанцыі, Станкевіч ізноў, ужо ў другі раз, стаў Шыедам. Жанчына перакананая, што сын адказвае за злачынствы іншых кіраўнікоў «Аўтатэкса» і працягвае даказваць яго невінаватасць.

Як аказалася, кіраўнікі фірмы, што працавала і пасля ад'езду Станкевіча з Беларусі, зніклі без следу. Па чутках, у Іспаніі.

Сам Шыед-Станкевіч сёння спадзяецца адно на рашэнне суда ў Страсбургу. Ён падаў позву супраць Украіны, бо лічыць сваё затрыманне ў Барыспалі незаконным. Сваёй віны спадар Шыед не прызнае. На дадзены момант яму засталося адбываць у турме тры гады.

**Алесь Пілецкі**

## Сцісла

• **Бацька з сынамі загінулі — праехалі на роварах каля абарванага дроту высакавольтнай лініі.** Няшчасце адбылося ля вёскі Мацюты Горацкага раёна. Дрот ляжаў на зямлі, 36-гадовы мужчына з трыма сынамі ехаў побач на роварах. Смяротны ўдар току прыпаў на аднаго з 12-гадовых хлопчыкаў-блізнят, калі бацька са старэйшым сынам ужо праехалі небяспечны ўчастак. Мужчына кінуўся ратаваць дзіця і загінуў. Памёр і другі блізнюк, схапіўшыся за раму веласіпеда, па якой ішоў ток. Зараз высвятляецца, чаму абарваўся высакавольтны провад.

• **Раскрытае забойства 14-гадовай даўніны.** Крымінальная справа па факце знікнення 36-гадовага жыхара вёскі Мормаль была распачатая яшчэ ў 1996 годзе. Цяпер устаноўлена, што мужчыну ў час сваркі забіла сякерай 41-гадовая сужыцелька і труп закапала за гаспадарчай пабудовай. Парэшткі былі знойдзеныя на тым тыдні.

• **У Гомелі спёка патушыла Вечны агонь.** З просьбай змяніць рэжым гарэння Вечнага агню на плошчы Працы ў Гомелі і на Кургане Славы па Рэчыцкай шашы да прадпрыемства «Гомельміжрайгаз» звярнуўся гарвыканкам. Цяпер Вечны агонь будзе гарэць у пятніцу, суботу, нядзелю — з 11.00 да 16.00; у астатнія дні будзе часова выключаны з мэтай папярэджання здарэнняў.

• **Пенсіянера з Гомеля забілі за тэлевізар.** Труп пенсіянера з пашкоджаннямі быў знойдзены ў доме, дзе ён жыў. Смерць наступіла ў выніку закрытай чэрапна-мазгавой траўмы, шматлікіх пераломаў рэбраў і пераломаў пад'языковай косткі. Па падазрэнні ў забойстве затрыманы 25-гадовы раней судзімы гамяльчук і 24-гадовая раней судзімая жыхарка Маладзечна. Пасля забойства яны выкралі з дома ахвяры тэлевізар «Віцязь».

**Кіроўца збіў насмерць скутэрыста.** ДТЗ адбылося на аўтадарозе Кобрын—Маларыта непадалёк ад вёскі Патрыкі. За рулём «Мерсэдэса» ехаў 25-гадовы непрацуючы жыхар Кобрына. 53-гадовы скутэрыст памёр на месцы.

• **Пераразанне горла пілой было суіцыдам?** Як паведамлялася раней, у Рэчыцкім раёне 20-гадовы рабочы, жыхар вёскі Будка, зарэзаўся мотакустарэзам. Цяпер высветліліся новыя акалічнасці. Пра смерць маладога чалавека вырашылі паведаміць бабулі, але суседзі знайшлі ў хляве яе труп, прысыпаны сенам. Мяркуецца, што ўнук яе задушыў, потым перарэзаў горла, а праз некаторы час і сам скончыў жыццё самагубствам.

**СМ**

# Пазняк: Лозунг «Абы не Лукашэнка» шкодны

З лідэрам Кансерватыўна-хрысціянскай партыі БНФ гутарыў журналіст Беларускай рэдакцыі Польскага радыё. Прапануем урыўкі з гутаркі.



**— Неўзабаве ў Беларусі адбудуцца чарговыя прэзідэнцкія выбары. Ваша партыя традыцыйна ўжо заклікае байкатаваць іх. Ці не было б больш рацыянальна накіраваць сілы на згуртаванне людзей вакол нейкага лідэра і ідэі, а не проста адмовіцца ісці на выбарчы ўчастак?**

— Калі б была такая асоба, тады можна было б пра гэта гаварыць. Паколькі такія асобы альбо знішчаныя, альбо выгнаныя, альбо задушаныя ў зародку, то сітуацыя нашая не змянілася на працягу 10 гадоў.

**— Але якім чынам байкот можа кансалідаваць народ?**

— Людзі ведаюць, што сусед не хадзіў галасаваць, я не хадзіў, жонка не хадзіла. Адкуль тады 90%? На выбарах дыктатуру нельга перамагчы, яе трэба разгойдваць і ствараць умовы, каб можна было перамагчы.

**— Вы ўзгадвалі магчымасць умяшання Расіі. Лукашэнку часта называюць «меншым злом», калі параўноўваюць з гіпатэтычным расейскім кандыдатам. Ці згодныя Вы з гэтым?**

— Гэта думанне людзей, якія пазбягаюць барацьбы. Выбар паміж Лукашэнкам і расейскім кандыдатам прыкладны такі самы, як паміж куляй і пятлёй. А якая насамрэч розніца? Мы павінны змагацца супраць абедзвюх небяспек.

**— Частка кандыдатаў, якія заявілі пра свой намер удзельнічаць у выбарах, ужо цяпер кажуць пра магчымасць паўтору Плошчы, але з паспяховым вынікам. Ці магчымы, на Вашу думку, вулічны сцэнар змены ўлады?**

— У 2006 годзе людзей было шмат, яны гарэлі дзейнасцю. Другі раз такой Плошчы ўжо не паўторыцца. Тэарэтычна людзі могуць выйсці са сваім абурэннем на вуліцу. Але калі не будзе ніякай арганізацыі, калі не будзе лідэра з яснай ідэяй, дзеля чаго мы выйшлі, то гэта можа стаць нават небяспечным. Усё гэта могуць выкарыстаць зусім іншыя сілы.

Някляеў засведчыў сваю 100%-ю прарасейскасць.




SVABODA.ORG

Нельга паўтараць сітуацыю 1994 года, якая праходзіла пад лозунгам «абы не Кебіч». Вось гэта «абы не Кебіч» і прывяло да яшчэ горшай сітуацыі. Зараз такі лозунг «абы не Лукашэнка», не думаючы, што будзе далей, гэта не тое, шкодна, гэтага нельга рабіць. Кардынальна, чаго на гэтых выбарах трэба дасягнуць, гэта дабіцца аслаблення ўлады Лукашэнкі і ўзмацнення кансалідацыі грамадства на пратэстнай ноце.

**— Некаторыя кажуць, што, магчыма, прарасейскі кандыдат — гэта Някляеў. І хоць ніхто яго не злавіў за руку і не мае доказаў, то ўсё ж плёткі такія тыражуюцца з усіх бакоў.**

— Палітыка — гэта як матэматыка. Там ёсць абсалютна дакладныя рэчы, якія вызначаюць пазіцыю чалавека.

Някляеў засведчыў сваю 100%-ю прарасейскасць. Тое самае Казулін. Ніколі не займаўся палітыкай і раптам пайшоў у прэзідэнты. Пачаў выдаваць Быкава. З Быкава, дарэчы, яны ўсе пачынаюць. Калі Някляеў пойдзе далей і не ўлічыць вопыт Казуліна, то ён паўторыць той самы шлях.

# Калі будзе спынена распальванне варожасці да цыганоў?

Усе грамадзяне роўныя; у злачынцаў няма нацыянальнасці. Піша **Анатоль Сідарэвіч**.

Напачатку асабісты ўспамін.

У адзін з гадоў міліцыя «павязала» групу грамадзян, якія сабраліся ўшанаваць гадавіну Слуцкага збройнага чыну. «Павязалі» і мяне. Афіцэр міліцыі дапытваўся ў мяне, якая мая нацыянальнасць. Я ж тлумачыў, што не абавязаны называць сваю нацыянальнасць, што такой графы няма ў пашпарце і што права не называць сваю нацыянальнасць дадзена мне Канстытуцыяй.

Як выявілася, для «органаў» Канстытуцыя — не закон. У іх, у сістэме Міністэрства ўнутраных спраў, аказваецца, ёсць бланкі, у якіх маецца графа «нацыянальнасць». Гэта наштурхнула мяне на думку, што нашы слаўныя «органы», мусіць, выводзяць у сябе нейкую статыстыку наконт таго, якая нацыя з'яўляецца самай правапарушальнай.

Увесь свет прачытаў, як абыходзілася міліцыя з камерунскім футбалістам Гі Франсуа Тукамам у славутым ізалятары на вул. Акрэсціна ў Мінску.



Пра тое, што ў Беларусі расізм практыкуецца, сведчаць і паведамленні крымінальнай хронікі, заснаваныя на міліцэйскіх зводках. У інфармацыйных матэрыялах пра злачынцаў абавязкова падкрэсліваецца іх прыналежнасць да цыганскай нацыянальнасці, у той час як у інфармацыйных матэрыялах аб правапарушэннях, учыненых прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцяў, чытачам пра іх нацыянальную прыналежнасць не паведамляюць.

У цывілізаваным грамадстве прынятыя дзве аксіёмы: усе грамадзяне роўныя; у злачынцаў няма нацыянальнасці. Лічу, што Беларусь у пэўнай меры цывілізаваная краіна. Таму грамадскасць мае права спытацца ў «органаў»: калі з бланкаў анкет, пратаколаў і г. д. будзе прыбрана графа «нацыянальнасць»? Калі ў інфармацыйных матэрыялах аб учыненых правапарушэннях знікне ўказанне на прыналежнасць праварушальнікаў да цыганскай нацыянальнасці?

**Анатоль Сідарэвіч**

гісторык, логік, намеснік старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамады).

З ПОШТЫ РЭДАКЦЫІ

# Падтрымайма прэзідэнта

Водгук на артыкул «Кіргізскі сцэнар для Беларусі: ці будуць у Мінску страляць» з «НН» № 27 ад 21 ліпеня 2010.

Артыкул Андрэя Дынько карысны, але патрабуе далейшага аналізу. Увесь час нашы аналітыкі звяртаюць увагу на «рашэнні», «меркаванні» і забываюцца пра «сілу». Між тым, як у сусвеце, так і ў палітыцы «сіла» ёсць асноўным аргументам!

Дынько пытаецца: «Чаго дабіваецца Расія?» І адказвае: «Захавання статус-кво ў адносінах з Беларуссю і пры гэтым змяншэння энергетычнага гранта». Хо-хо-хе-хе… Для Расіі пяць мільярдаў долараў у год лішніх тратаў нічога не вырашаюць.

Неяк наш прэзідэнт выказаў сваё жаданне: «Вы, Расія, павінны ставіцца да нас, як ЗША да Ізраіля!» Лепш і не скажаш! Усе сто адсоткаў грамадзян нашай Беларусі падтрымаюць гэтую тэзу!

Дарэчы, ЗША не прымушае ізраільцян адмовіцца ад сваёй мовы, ад сваёй веры і ад сваёй гісторыі, што робіць у дачыненні да Беларусі Расія. Між тым, паглынанне нашай краіны РФ лагодна называюць «яднаннем двух брацкіх народаў».

Расія і сёння — гэта драпежная імперыя! Мэта яе нават сёння — далучэнне сатэлітаў і высмактванне жыццёвых сіл з гэтых сатэлітаў. Мэта РФ — далучэнне Беларусі да Расіі ў якасці суб'екта федэрацыі.

Дарэчы, пошліны на нафтапрадукты былі прыняты Пуціным пасля таго, як ён на саміце СНД у Мінску ўбачыў нашу Нацыянальную бібліятэку. Заела, узяло за жывое, ударыла па самалюбстве расійскага носьбіта ўлады.

Некаторых расійскіх чыноўнікаў да сёння заядае нават існаванне нашай футбольнай зборнай і поспехі БАТЭ. У Расіі яшчэ і сёння ўсе імперыялісты: ад бамжа да прэзідэнта, нават інтэрнацыяналіст Зюганаў — таксама расейскі імперыяліст.

Наш прэзідэнт сёння — гэта першы беларускі палітык за сто год.

І ў Кіргізстане Расія дзейнічала перш за ўсё дзеля таго, каб захаваць і ўзмацніць свой уплыў.

Далей Дынько выказвае думку: «Калі наканавана адбыцца зменам, яны адбудуцца пад тымі сцягамі, якія запануюць на вуліцы». Сцягі ў дадзеным выпадку — гэта рэквізіт. Галоўнае, хто прыйдзе пад тымі сцягамі да ўлады?

Канечне, як палітык наш «бацька» перарос ролю палітычнага паслугача РФ. Акрамя таго, несумненныя эканамічныя поспехі нашай краіны кідаюць цень на метраполію, якая мае велізарныя багацці, а патанае ў бязладдзі і карупцыі. Калонія (а мы, фактычна, калонія Расіі, нават мова ў нас пануе каланіяльная) не можа жыць лепш, чым метраполія!

Наш прэзідэнт сёння — гэта першы беларускі палітык за апошнія сто год, пасля Антона Луцкевіча, які ў свой час выклаў ідэю стварэння незалежнай Беларусі. Палітык — гэта капітан карабля, які ўвесь час ловіць пераменлівы вецер у ветразі свайго парусніка. Ён мацнейшы за першых прэзідэнтаў Грузіі ці Азербайджана, толькі першы першы прэзідэнт Казахстана Назарбаеў роўны яму, бадай.

Пераход ад расійскага таталітарызму да еўрапейскай дэмакратыі ў нашай краіне — гэта ўтопія, да ўлады прыйдзе імперская мафія.

Калі цяперашні прэзідэнт верне нам мову, бел-чырвона-белы сцяг, "Пагоню", гістарычную спадчыну ВКЛ, скарыстае ў дзяржаўнай палітыцы нацыянальную ідэю, то за ім пойдуць мільёны людзей.

Што датычыць апазіцыі, то ёй трэба помніць, што «розум» таксама з'яўляецца «сілай». Толькі трэба знайсці супольныя грамадскія інтарэсы між уладай і патрыятычнай апазіцыяй.

**Кастусь Травень, Магілёў**

### Ад Рэдактара. Сякера пад лавай

Думкі даўняга чытача і аўтара «НН» у дадзеным выпадку падаліся мне тэарэтычна правільнымі, як газ у колбе, але мала карыснымі пры сутыкненні з рэальнасцю.

Так, Расія імперская і мае эканамічны інтарэс. Але найлепш абараняюць нацыянальныя інтарэсы не аўтарытарныя кіраўнікі, а дэмакратыі ў складзе ЕС. У іх уплыў Расіі найменшы, узровень жыцця высокі, а стан нацыянальных культур — упэўнены.

«Несумненныя эканамічныя поспехі» выглядаюць сумнеўнымі, як толькі пераязджаеш польскую мяжу.

Чаму Літве ці Малдове па сілах было перайсці ад таталітарызму да дэмакратыі, а Беларусі — не? «Не адразу!» — пачую пярэчанне як сп.Траўня, так і лукашэнкаўцаў (акадэміка Рубінава, прыкладам). Але ж і пераходны перыяд аўтарытарызму доўжыцца ўжо 20 гадоў! На захад і поўнач ад Беларусі ў Еўропе няма ніводнай аўтарытарнай дзяржавы. Напэўна, яшчэ і таму, што такія дзяржавы неэфектыўныя эканамічна.

Хто як не Лукашэнка падтрымліваў і заахвочваў імперскую экспансію? Дамовы пра СПА, сілы хуткага рэагавання АДКБ і Мытны саюз былі ягонымі нядаўнімі крокамі ў тым кірунку.

Падтрымліваць такога Лукашэнку? Зрэшты, ён і не мае патрэбы ні ў якай народнай падтрымцы. Менавіта таму назіральнікам забаронена сачыць за падлікам галасоў на выбарах, забаронена любая публічная крытыка кіраўніка дзяржавы, а ўсе механізмы грамадскага абмеркавання ператвораны ў прафанацыю, прыстасаваны для «адабрямса» загадзя вызначаных рашэнняў. Дадуць вам права голасу, спадару Травень, тады і падтрымаеце.

Спадзяванні, што Лукашэнка «пяройдзе на мову», «скарыстае нацыянальную ідэю» — гэта спадзяванні на цуд і дзядзьку. Лукашэнка 16 гадоў абапіраецца на іншыя сілы, а кіруе ім ягоны асабісты інтарэс і інтарэсы ягоных сыноў. Выкарыстоўваць нацыянальную ідэю ён будзе ў той ступені, у якой яны будуць здольныя падоўжыць ягонае кіраванне ці дапамогуць захаваць уласнасць пад сваім кантролем.

Што ў такім разе людзям Вашых перакананняў, спадару Травень, карысна рабіць для абароны сваіх асабістых і нацыянальных інтарэсаў? А тое самае, што рабілі раней: паслядоўна падтрымліваць беларускамоўных і \ ці праеўрапейскіх палітыкаў, ставіць за іх подпісы, ставіць подпісы пад нацыянальнымі петыцыямі і зваротамі ў абарону правоў чалавека і прыватнай уласнасці, удзельнічаць у незалежных ад дзяржавы асяродках і суполках і найперш фінансаваць іх дзейнасць, як і выхад незалежных СМІ, сайтаў. І — дбаць пра ўласныя сем'і, развіваць уласны бізнэс, уласныя асяродкі.

Незалежная актыўнасць знізу стварыла нацыі фінскую, чэшскую і літоўскую, а «добрыя цары» вымушаныя былі ў сваіх інтарэсаў тое трываць.

У чым са сп.Траўнем пагаджаюся цалкам, дык гэта з думкай, што незалежнаму грамадству — аснове нацыі — варта акуратна лавіраваць, каб ні ў якім разе не спрыяць русіфікацыі і ўзмацненню расійскіх інтарэсаў у Беларусі.

«Шлях будзе доўгі, і мы павінны да гэтага прызвычаіцца, — сказаў Зянон Пазняк у сваім нядаўнім інтэрв'ю і прывёў прыклад. — Калісьці чэхі пабудавалі тэатр «Narodne divadlo», грошы яны збіралі па ўсёй краіне. У дзень яго адкрыцця ненавіснікі чэшскай культуры і дзяржавы спалілі тэатр. Што робіць нацыя? Імгненна абвяшчае новы збор сродкаў і зноў стварае тэатр. Свабода — гэта доўгая праца».

# «Хросны бацька-3» — мазаічны

Працяг са старонкі 1.

## Дэбют Някляева

Упершыню ў фільме з’явіўся Уладзімір Някляеў. Лідэр кампаніі «Гавары праўду» абвінавачвае сённяшнюю ўладу ў кланавасці.

Чарговы раз былі закранутыя аспекты прыватнага жыцця Лукашэнкі. Прычым у пераказе чутак і гіпотэз аўтары пайшлі далей, чым у папярэдніх серыях.

Асобнае апавяданне было аб прэзідэнцкім фондзе, які, па ацэнках аўтараў, складае ад 8 да 12 мільярдаў даляраў. Выказваецца меркаванне, што гэтыя грошы страсаюцца ў прадпрымальнікаў. Дэпартаваны з Беларусі аналітык Міхаіл Падаляк бажыўся, што асабіста бачыў спіс з 14 000 бізнесменаў, якія аддаюць грошы ў гэтую казну.

Былі закранутыя адносіны Лукашэнкі з, як выказаліся ў фільме, «беларускімі алігархамі» Юрыем Чыжом і Уладзімірам Пефціевым. Чаму гэта не дзяржаўныя прадпрыемствы, а прыватная кампанія Чыжа зарабляла на перапрацоўцы і перапродажы нафтапрадуктаў — задаюцца пытаннем стваральнікі фільма. А Пефціеў — на продажы зброі (дарэчы, гэтая тэма зусім не раскрытая). Гэта сумесны бізнес з прэзідэнцкай сям’ёй, мяркуюць аўтары фільма.

## Новы персанаж — Лілія Лукашэнка

Як доказ прыводзіцца супольнае трыманне латарэйнага бізнесу Пефціевым і Дзмітрыем Лукашэнкам. Прыводзіцца і раней невядомае меркаванне, што жонка Віктара Лілія Лукашэнка з’яўляецца генеральным дырэктарам буйной кампаніі, якая займаецца нерухомасцю і належыць усё таму ж Пефціеву. Аднак ніякіх крыніц не цытуецца.

«НН» спрабавала высветліць, ці так гэта, аднак ніякай афіцыйнай інфармацыі не здабыла. Пэўная «Лілія Лукашэнка» сапраўды фігуравала як прадстаўніца кампаніі Eastleigh Trading LTD, што зарэгістраваная на Кіпры і цяпер, у прыватнасці, займаецца праектам забудовы па адрасе Свярдлова, 2, у непасрэднай блізкасці да плошчы Незалежнасці ў сталіцы. Аднак ці гэта нявестка Аляксандра Лукашэнкі, ці гэта супадзенне прозвішчаў, высветліць не ўдалося.

Успомнілі «энтэвэшнікі» і пра гучную справу следчай Святланы Байковай. Дэманструюцца ўнікальныя кадры допыту, які праводзіла Байкова па справе мытнікаў. Дапытвалі Паўла Малочку, які за супрацоўніцтва са следствам пазбег турмы.

Байкова трапіла за краты, бо яе расследаванне закранула інтарэсы сям’і кіраўніка дзяржавы, робіць выснову аўтар перадачы. Ускосна пацвярджае гэта збеглы капітан МУС Вячаслаў Дудкін, які кажа, што расследаванне сур’ёзных справаў у Беларусі немагчымае. «Карпарацыі «Лукашэнка і сыны» я не служыў», — кажа Дудкін, якога здымалі ў адным з заходнееўрапейскіх гарадоў.

## Рэзкасці палкоўніка Барадача

Не дае Лукашэнка працаваць і прадпрымальнікам, даводзіць фільм НТВ. Дарэчы, у фільме робіцца акцэнт на тым, што Лукашэнка прыцясняе, адбірае бізнэс, высылае з краіны менавіта расіян.

Эфектна з’яўляецца ў фільме палкоўнік Уладзімір Барадач. Былы камандзір мар’інагорскага спецназа і саратнік Захаранкі кажа, што ў Беларусі «кіруе не закон, а пахан». Расказваюць, як у яго на мяжы сканфіскавалі сем тысяч еўра, з якімі ён ехаў у Нямеччыну купляць машыну. Барадач называе беларускую мяжу не тварам, а «непадцёртай задніцай краіны».

«Ніякіх ілюзій у мяне наконт выбараў няма, — кажа У.Някляеў. — Біць будуць жорстка, як ніколі. Бо падраслі дзеці, якія захочуць утрымаць уладу ў сваіх руках».

## Бізнэс і медыцына

Напрыканцы фільма ўзнімаецца даўняя гісторыя пра «мазаічную псіхапатыю». Кадры доктара Змітра Шчыгельскага, які паставіў гэты дыягназ. Пасля доктар з маскоўскага Інстытута псіхіятрыі імя Сербскага расказвае пра асаблівасці паводзінаў мазаічных псіхапатаў.

Якія гэта мае адносіны да зададзенай тэмы — бізнэсу сям’і Лукашэнкі? Ніякіх. Але ў тон фільма трапляе.

Трэцяя частка «Хроснага бацькі» выйшла больш рэзкая за папярэднія. І яе тон сведчыць, што апошняй яна не будзе.

**Зміцер Панкавец**

Уладзімір Барадач: «У Беларусі кіруе не закон, а пахан».




**Эфектна з’яўляецца ў фільме палкоўнік Уладзімір Барадач.**

Вячаслаў Дудкін: «Карпарацыі «Лукашэнка і сыны» я не служыў»




**Збеглы капітан Дудкін: расследаванне сур’ёзных справаў у Беларусі немагчымае.**




## Уладзімір Някляеў: Ад такіх нападкаў Лукашэнку будзе лёгка адбіцца

Лідэр грамадскай кампаніі «Гавары праўду» Уладзімір Някляеў быў адным з герояў перадачы «Хросны бацька–3». Для здымак ён адмыслова ездзіў у Маскву.

**«Наша Ніва»: Як Вам фільм? Спадабаўся?**

**Уладзімір Някляеў:** Дынамічны, напорысты, з энергетыкай. Шмат плюсаў у ім, але і мінусаў хапае. Найперш, што так і не было агучана канкрэтных фактаў карупцыі з боку атачэння Лукашэнкі. Не было спецыяльных дакументаў. Па-другое, аўтары фільма кіраваліся агульначалавечымі маральнымі каштоўнасцямі, але для многіх гэта нічога не значыць. Аўтары фільма падкрэсліваюць палігамнасць Лукашэнкі ў стасунках з жанчынамі, але шмат для каго — гэта нават станоўчы момант. І такая сітуацыя не толькі ў Беларусі, але па ўсёй Еўропе. Узгадайце таго ж Берлусконі.

**«НН»: А чаму Вы пагадзіліся ўдзельнічаць у «Хросным бацьку»?**

**УН:** Таму, што гэты фільм тычыўся сур’ёзных рэчаў. Я адразу папярэдзіў тэлевізійшчыкаў, што не маю дакументаванай базы, якая б пацвердзіла мае словы аб кланавасці ўлады, аб карупцыі. Яны сказалі, што маюць такіх людзей у адпаведных структурах і такія дакументы, а я ім патрэбны, каб агульна абмаляваць сітуацыю, што і зрабіў.

**«НН»: А якога эфекту чакаеце ад фільма?**

**УН:** Я чакаю разуменне людзьмі, хто кіруе краінай, што гэта за чалавек. Хачу, каб людзі зразумелі, што гэты чалавек не варты займаць найвышэйшую пасаду ў краіне.

**«НН»: Будзеце рэкамендаваць людзям глядзець «Хроснага бацьку»?**

**УН:** Хай бы паглядзелі. Зрэшты, для расійскага гледача — гэта сенсацыя. А для нашага, які хоць трохі арыентуецца ў палітычных працэсах, ніякай сенсацыі няма, вялікага ўплыву няма таксама. Яшчэ раз паўтаруся, калі былі б агучаныя канкрэтныя факты махінацый, з канкрэтнымі дакументамі, то гэта б мела іншы эфект. А ад такіх, нічым не пацверджаных нападкаў, Лукашэнку будзе лёгка адбіцца.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**

## Алег Воўчак: Мне прапаноўвалі матэрыялы справаў Байковай за 50 тысяч даляраў

З’яўленне ў «Хросным бацьку» кадраў допытаў, што праводзіла следчая Святлана Байкова, скандальныя. Па ідэі, гэтае відэа павінна знаходзіцца ў сакрэтных матэрыялах крымінальнай справы. Тым не менш, яно стала даступным для гледачоў НТВ. Адкуль гэтае відэа змагло з’явіцца ў тэлевізійнікаў? Няўжо ў МУС ці КДБ з’явіліся новыя праціўнікі Лукашэнкі? З гэтым пытаннем мы звярнуліся да былога следчага Алега Воўчака.

«Дастаткова шмат людзей займалася справамі пра кантрабанду на мяжы. Па маіх звестках, матэрыялы справы ёсць як мінімум у пяці супрацоўнікаў следчых органаў. Калі справа толькі пачыналася, то мне прапаноўвалі набыць усе матэрыялы аб карупцыі, якія расследавала Байкова. Паставілі за гэта цану 50 тысяч даляраў. У мяне такіх грошай, натуральна, не было.

Ведаеце, усе гучныя справы ёсць у некалькіх копіях. Тое самае па справах зніклых палітыкаў. Следчыя, як і аператыўнікі, перастрахоўваюцца. Як я зразумеў падчас здымак «Хроснага бацькі», гэта не апошнія матэрыялы, якімі валодае НТВ. Такія матэрыялы ёсць шмат у каго ў службовым карыстанні, таму дакапацца, ад каго яны трапілі да расіян, будзе цяжка».

**ЗП**

# Аляксандр Зімоўскі: Ад Лукашэнкі чакаюць хаджэння ў Каносу

Што калі выбары будуць прызнаныя Крамлём нелегітымнымі? «А каго гэта хвалюе?» — кажа кіраўнік БТ.

Яшчэ ў маі старшыня Белтэлерадыёкампаніі Аляксандр Зімоўскі спрагназаваў інфармацыйную атаку на беларускае кіраўніцтва. У сваім блогу на сайце naviny.by ён напісаў: «Яшчэ да пачатку агульнанацыянальнай палітычнай кампаніі СМІ суседніх дзяржаваў пачынаюць узгодненa і надобразычліва асвятляць падзеі, што ў нас адбываюцца. Паток крытыкі, які ўвесь час нарастае, не можа застацца без увагі. Цікаўнасць і скандальнасць не ў апошнюю чаргу забяспечваюцца масіраваным злівам кампрамату на высокапастаўленых асоб».

**«Наша Ніва»: Інфармацыйная атака ідзе па Вашым сцэнары, ці ёсць некаторыя нечаканасці?**

**Аляксандр Зімоўскі:** Не, нічога нечаканага для мяне няма.

**«НН»: І як Вам рэакцыя давераных Вам СМІ?**

**АЗ:** Ведаеце, мне здаецца, што нашы ўдары не дастаюць адзін да аднаго. Мы можам уздзейнічаць толькі пры дапамозе «Беларусь-ТВ», што транслюецца ў Расіі. Тым не менш, мне здаецца, што нашы журналісты рэагуюць эфектыўна і хутка. Расійскі ж бок проста выконвае палітычны заказ. Гэта як на дуэлі. Яны выбіраюць зброю, а нам даводзіцца толькі адказваць. Натуральна, што атакуючы бок мае пэўную перавагу. Але нам удаецца яе нівеляваць.

**«НН»: Якую мяжу Расія можа пераступіць у гэтым інфармацыйным канфлікце?**

**АЗ:** Ну, не думаю, што Беларусь абвесцяць краінай паліцаяў. Тым не менш, кіроўную эліту і вярхі будуць па-ранейшаму мяшаць з граззю. Людзей тут не чапаюць, а толькі кіраўніцтва. Тым не менш, у апошняй частцы «Хроснага бацькі» было ясна падкрэслена, што дзяржава наязджае на простых людзей, на прадпрымальнікаў, фірмы, выціскае з іх бабкі. Гэта самы небяспечны пасыл.

**«НН»: А якіх мэтаў хоча дасягнуць Расія?**

**АЗ:** З улікам таго, што ў нас апошнім часам значна палепшыліся адносіны са Святым Пасадам, то ўзгадаю адзін выпадак з яго гісторыі. Ён датычыць імператара Генрыха і Папы Рымскага Рыгора VII. Калі Рыгор заняў папскі прастол, то ён адразу паспрабаваў абмежаваць імператарскую ўладу. Пасля Генрыха адлучылі ад царквы. Графы і герцагі запатрабавалі ў імператара прасіць папскую літасць. Урэшце Генрых басанож прыбыў у Каносу, дзе ў той час знаходзіўся папа. Але яго тры дні не пускалі, увесь гэты час ён плакаў і прасіў злітавацца. Князі і біскупы моўчкі глядзелі на гэтыя прыніжэнні Генрыха. Думаю, што ў Расіі хочуць такога самага хаджэння ў Каносу ад нашага кіраўніцтва.

**«НН»: Але «Хросны бацька» прыніжае не проста кіраўніка дзяржавы. Гэта і абраза самой дзяржавы. Чаму няма рэакцыі той самай дзяржавы?**

**АЗ:** Гэта розныя рэчы. Калі б там сцяг растапталі ці асправаілі беларускі суверэнітэт, то тады, канечне, варта было б выклікаць на размову пасла Расіі. Тут жа праходзяцца па асобах. Па абразе прэзідэнта ў нас ёсць іншы артыкул, напрыклад. Калі «Рэспубліка» друкуе артыкул Мілова і Нямцова, то хіба гэта абраза Расіі? Не. Гэта парытэтныя кампаніі.

**«НН»: Дык, можа, трэба было гэты фільм паказаць, калі нічога страшнага ў ім няма?**



У фільме дэманструюцца рэдкія кадры Віктара і Дзмітрыя Лукашэнкаў.

**АЗ:** НТВ не прапаноўвала нам яго купіць. (Смяецца.) Гэты тэлеканал і раней так рабіў, што здымаў пэўны матэрыял, а потым прапаноўваў героям перадач яго купіць, каб той не выйшаў у эфір. Можа, хацелі, каб і мы так зрабілі.

**«НН»: А як Вам рэакцыя на фільм апазіцыі і грамадства?**

**АЗ:** Апазіцыя пляскае ў далоні. Гэта і зразумела. Грамадства ж абсалютна абыякавае.

**«НН»: Можа, фільм атрымаў сенсацыйнае адценне таму, што на дзяржаўных тэлеканалах адсутнічае любая крытыка кіраўніка дзяржавы?**

**АЗ:** А крытыкі там мы так і не пачулі. Там не ставіцца пад сумнеў эканамічная мадэль развіцця краіны ці сацыяльная палітыка. Гэтага няма. Фільм цалкам складаецца з надуманай інфармацыі, якая дастаткова даўно цыркулюе ў Беларусі ў выглядзе чутак і плётак. Мы пабачылі асабістыя наезд па асабістых матывах.

**«НН»: Не так даўно на сваім блогу Вы раскрытыкавалі беларускую дыпламатыю і разведку за тое, што яна прахлопала інфармацыйную атаку. Чаму Ваша рэакцыя была такой рэзкай?**

**АЗ:** Таму, што няма яснай карціны свету. Інфармацыя павінна быць нефільтраванай. Калі нехта фільтруе інфармацыю, баючыся, скажам, сапсаваць настрой Аляксандру Лукашэнку, то гэта злачынцы, якіх, не пабаюся сказаць, трэба мачыць.

**«НН»: На Ваш погляд, Расія можа падтрымаць на выбарах іншага чалавека, а не Лукашэнку?**

**АЗ:** У Расіі няма магчымасцяў уплываць на нашу сітуацыю. Лёс краіны будзем вырашаць толькі мы з вамі.

**«НН»: А калі выбары будуць прызнаныя Крамлём нелегітымнымі?**

**АЗ:** А каго гэта хвалюе?

**Гутарыў Зміцер Панкавец**

**Аляксандр Зімоўскі**

нар. у 1961 у Германіі. Служыў у савецкім войску (1979—1984). Скончыў тры курсы факультэта вайсковай журналістыкі Львоўскай вышэйшай вайскова-палітычнай вучэльні (1980—1983), факультэт банкаўскай справы Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта (2007). Быў працоўным Барысаўскай райаграпрамтэхнікі, карэспандэнтам шэрагу газет і часопісаў, працаваў у Югаславіі падчас вайсковага канфлікту на Балканах (1998—1999). З 2000 па 2002 — намеснік старшыні Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Беларусі. Ад 1995 да 2001 вёў інфармацыйна-аналітычную праграму «Рэзананс» на БТ. У 2002 стаў генеральным дырэктарам ЗАТ «Сталічнае тэлебачанне». 22 снежня 2005 прызначаны кіраўніком Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі.

### АНТ нагадаў Расіі пра ўласныя шкілеты ў шафе

У нядзельным выпуску «Контураў» прагучала імя расійскай праваабаронцы Наталі Эстэміравай, застрэленай год таму. Адбылося гэта 15 жніўня,калі расійскі тэлеканал НТВ паказаў чарговую серыю «Хроснага бацькі». Сюжэт у «Контурах» не цягнуў на сіметрычны адказ. Гэта была кароткая згадка пры канцы выпуску, акрамя тэмы гучнага забойства гаварылася пра праблему знікнення ў Расіі простых людзей, якіх потым родныя шукаюць праз папулярную перадачу «Знайдзі мяне». Аднак сам факт з'яўлення падобных сюжэтаў на дзяржаўных тэлеканалах як бы кажа: разбярыцеся спачатку са сваімі зніклымі ды забітымі.

Праваабаронца з Чачні, супрацоўніца «Мемарыяла», 15 ліпеня 2009 г. была выкрадзеная ад уласнага дома ў Грозным. У той жа дзень яе знайшлі застрэленай ля федэральнай аўтадарогі «Каўказ» у Інгушэціі. На афіцыйным узроўні забойства Эстэміравай звязалі з яе праваабарончай дзейнасцю. Кіраўнік «Мемарыяла» Алег Арлоў звінаваціў у гібелі праваабаронцы кіраўніка Чачні Рамзана Кадырава.

Эстэмірава — не адзінкавы выпадак гучнага палітычнага забойства ў сучаснай Расіі. 7 кастрычніка 2006 г. у ліфце свайго дома ў Маскве была застрэленая журналістка і праваабаронца Ганна Паліткоўская, аўтарка серыі рэпартажаў з Чачні і дакументальнай кнігі «Падарожжа ў пекла. Чачэнскі дзённік». 19 студзеня 2009 г. у цэнтры Масквы стрэлам у галаву быў забіты адвакат Станіслаў Маркелаў. Разам з ім была смяротна параненая журналістка Анастасія Бабурава. Маркелаў быў адвакатам сям'і згвалтаванай чачэнкі Эльзы Кунгаевай у справе супраць палкоўніка Юрыя Буданава.

**СП**

# «Белсат» не выключае магчымасці паказу «Хроснага бацькі»

Але і вялікага сэнсу ў гэтым не бачыць.

Расійскі тэлеканал НТВ паказаў трэцюю частку скандальнага дакументальнага фільма «Хросны бацька». У Беларусі ён быў даступны толькі ўласнікам спадарожнікавых антэнаў, бо, як і ў папярэдніх выпадках, на «НТВ-Беларусь» у гэты час паказвалі іншыя перадачы. Згодна сацыялагічнага даследавання, зладжанага літоўскім агенцтвам Baltic Surveys, пра фільм «Хросны бацька» ведае каля 35% беларусаў. Яго пабачыў кожны сёмы гарадскі жыхар Беларусі. Большасць — каля 52% — на ўласныя вочы «Хроснага бацьку» не бачылі, а даведаліся пра яго ад сяброў або з інтэрнэту.

Мы звярнуліся ў прэс-службу беларускага незалежнага спадарожнікавага тэлеканала «Белсат» з пытаннем, ці не плануе той паказаць скандальны серыял або самастойна зняць нешта падобнае.

Фільм «Хросны бацька» агульнадаступны, таму няма асаблівых прычынаў набываць яго і паказваць на «Белсаце», патлумачыў прэс-сакратар тэлеканала Сяргей Пелеса. Хоць і выключаць такую магчымасць таксама нельга.

«Цяпер мы здымаем некалькі фільмаў пра падзеі ў найноўшай гісторыі Беларусі, з асаблівым акцэнтам на час ад апошніх выбараў», — кажа прэс-сакратар «Белсата». Напрыклад, фільм «Дзень "Ч"» пра Генадзя Карпенку. Яшчэ тры фільмы на падобную тэматыку рыхтуюцца да выпуску.

Сяргей Пелеса падкрэсліў, што серыя фільмаў «Хросны бацька» ёсць рэалізацыяй сённяшняй палітыкі Расіі. «Белсат» жа праз сваіх аўтараў прапануе беларускі погляд на падзеі і з'явы.

«Акрамя таго, у выпадку з НТВ ёсць такі аспект, як канкурэнцыя, бо ён мае тое самае поле дзейнасці, што і «Белсат», — Беларусь. Але пры гэтым між каналамі існуе вялікая розніца: НТВ паказвае «Бацьку», а «Белсат» — фільм пра Ларысу Геніюш. НТВ гэтага фільма не паказа і не здыме, у адрозненне ад «Белсата», які можа і зняць, і паказаць нешта накшталт «Хроснага бацькі».

**Сямён Печанко**

### Сіліцкі: сапраўднага кампрамату не дачакаемся

Чакаць, што, акрамя суцэльнай банальшчыны, расійскія тэлеканалы выкінуць на Лукашэнку «сапраўдны» кампрамат, не выпадае, лічыць палітолаг Віталь Сіліцкі.

Ва ўсіх грахах, якія павесілі на Лукашэнку тры серыі «Хроснага бацькі», непасрэдна саўдзельнічаў расійскі палітычны клас і яго вышэйшыя прадстаўнікі. І ў фінансавых, і нафтавых справах, і ў фальсіфікацыі выбараў. І дзесяцігадовае маўчанне па справах зніклых ёсць нішто іншае як пакрыццё. І калі раптам кампрамат паплыве, то што спыніць беларускі бок, каб не «здаць» усіх сваіх колішніх памагатых? Вядома, было б весела паназіраць, як справу зніклых слухалі б у Басманным судзе Масквы, а Мінскі гарадскі суд у перапынку паміж судамі над удзельнікамі акцыяў 16 сакавіка пачаў бы разглядаць справы Сечына з Сяргеем Івановым. Але такога спектакля мы ад беларускай і расійскай палітэліт не дачакаемся. Вельмі моцна яны трымаюць адна другую за тое ж самае месца.

# Сэкс у Вялікім Княстве

**Што мы ведаем пра інтымнае жыццё нашых продкаў? Пагартаем Статуты Вялікага Княства Літоўскага — зводы законаў, па якіх прадзеды жылі ад XVI да XIX стагоддзя.**

Паводле нормаў маралі, адлюстраваных у Статутах (1529, 1566 і 1588 гадоў), сэксуальныя дачыненні лічыліся нармальнымі толькі між мужам і жонкай. Прычым шлюб мусіў быць законным, венчаным. Дзеці ад такіх шлюбаў прызнаваліся законнымі і мелі права на спадчыну. Нават калі шляхціц браў замуж не шляхцянку, а мяшчанку ці сялянку, дзеці ўспадкоўвалі шляхецкае званне. Шляхцянка ж не магла надаць шляхецтва дзецям ад мешчаніна ці мужыка.

### Толькі са згоды

І нават у законным шлюбе інтымныя адносіны мусілі быць добраахвотнымі. Гвалтоўны прымус мог стаць прычынай разводу. Для духоўнага суда гэта была сур'ёзная прычына, бо паводле кананічнага права сэкс неабходны толькі для працягу роду. Таму прымушэнне да яго — гэта цяжкі грэх.

Паводле Статутаў 1566 і 1588 гг., забаранялася гвалтоўна браць дзяўчыну замуж. Такое дзеянне, адпаведна, прыводзіла да гвалтоўных сэксуальных дачыненняў. За гэтае злачынства мужчыну каралі смерцю, а траціна яго маёмасці пераходзіла пакрыўджанаму боку. З астатняй часткі кампенсаваліся страты. Калі высвятлялася, што дзяўчына была і не супраць, каб яе выкралі, яна пазбаўлялася спадчыны і пасагу. Шлюб без згоды бацькоў супярэчыў заканадаўству, звычаям і царкоўнаму праву.

### Гвалтуюць — крычы

Вельмі цяжкім злачынствам было згвалтаванне. За яго прадугледжвалася смяротная кара. Толькі згода ахвяры выйсці замуж за гвалтаўніка ратавала яго ад смерці.

Але як даказаць, што быў гвалт? Раптам жаночыя хітрыкі? Статут дае адказ: падчас гвалту ахвяра мусіла крычаць. Не крычала — значыць, была згодная. Пасля здарэння ў судзе прадстаўлялі сведак, а калі іх не было — паказвалі знакі згвалтавання. У судовых кнігах ёсць такія скаргі, але не заўсёды можна прасачыць вынік справы.

### Невянчаны шлюб

Не ўхваляла заканадаўства пазашлюбныя сэксуальныя дачыненні ў шляхецкім асяроддзі. І не столькі самі дачыненні, колькі іх вынік — пазашлюбных дзяцей. Яны называліся бенкартамі. Гэта дзеці, ад якіх адмовіліся бацькі, альбо народжаныя ад «грамадзянскай», невянчанай жонкі.

Артыкул згадвае пра існаванне невянчанага шлюбу. У ВКЛ ён праіснаваў вельмі доўгі час. У шляхецкім асяроддзі меў месца амаль да канца XVI ст. Гэта шлюб з вяселлем, але без вянчання. Царква мела слабыя пазіцыі ў грамадстве, не магла прымусіць вернікаў вянчацца. А многія лічылі, што сваё сямейнае жыццё яны могуць уладкаваць без яе блаславення. Скасаваць такі шлюб было прасцей. Сяляне проста разыходзіліся, а шляхціц са шляхцянкай давалі адно аднаму «разводныя лісты» ў судзе.

### Бенкарты

Статут 1566 г. пашырыў паняцце «бенкарт». Да іх сталі адносіцца не толькі дзеці, народжаныя ў невянчаным шлюбе, але і дзеці ад каханкі. Прычым яны не маглі стаць законнымі, нават калі шляхціц пасля смерці жонкі з каханкай жаніўся. І нават дзеці, якія з'яўляліся ў шлюбе пазней, не лічыліся законнымі.

Статут 1588 г. стаў прызнаваць незаконнымі дзяцей ад шлюбу між сваякамі — калі, беручы шлюб, яны ведалі аб сваяцтве.

Бенкарт быў асобай ніжэйшага гатунку. За яго забойства не каралі смерцю, як за шляхціца. Спагнанне было, як за простага чалавека. Наяўнасць бенкарта ў шляхецкай сям'і ставіла яе на ніжэйшую сацыяльную прыступку і пазбаўляла магчымасці перадаваць у спадчыну маёмасць. Такімі эканамічнымі рычагамі заканадаўцы змагаліся супраць дашлюбных і пазашлюбных сэксуальных дачыненняў.

Паводле Статута 1566 г., калі сваяцтва мужа і жонкі высветлілася ў шлюбе, то іх неабходна было развесці. Статут 1588 г. прысвяціў цэлы артыкул пераліку сваякоў, якім нельга браць шлюб. Забаранялася гэта аж да 4-й ступені сваяцтва. Але, калі вельмі хацелася, магчымасць была. Трэба было атрымаць спецыяльны дазвол ад духоўных асоб. Так, канюшы ВКЛ Багуслаў Радзівіл ажаніўся са сваёй пляменніцай Ганнай Радзівілаўнай.

### *Жорсткасць эпохі Сапегі*

Артыкулы супраць амаральных паводзінаў з'яўляюцца ўжо ў Статуце 1566 г. Дзяўчына пазбаўлялася спадчыны, калі жыла распусна і не жадала выходзіць замуж. Да мужчын такія санкцыі не ўжываліся. І праваслаўнае, і каталіцкае духавенства пастаянна скардзілася вялікаму князю на амаральнасць прыхаджанаў, таму ўвядзенне пэўных нормаў у заканадаўства выглядала неабходнасцю.

У Статуце 1588 г., які рэдагаваў канцлер Леў Сапега, з'явіліся жорсткія артыкулы. Пакаранне «горлам» прызначалася за звоз замужняй жанчыны з дому, нават калі яна была згодная. Яе таксама каралі смерцю (прыгадаем змадэляваную Караткевічам гісторыю Валюжыніча і Альшанскай з «Чорнага замка»).

Выратаваць жанчыну магло толькі адно: калі муж быў супраць пакарання. Калі ж падчас пагоні выкрадальнік забіваў мужа, то ён разглядаўся судом як гвалтоўнік супраць шляхецкага дому і караўся смерцю.



**Гравюра Скарынавай «Бібліі» (1519).**

Смяротная кара прызначалася і за шлюбную здраду. Каралі абаіх вінаватых. Прычым разглядаўся толькі выпадак, калі жонка здраджвала мужу. Муж-здраднік, зрэшты, таксама мог быць пакараны — як спакуснік чужой жонкі...

### Зводніку адразалі вушы

Ёсць у Сапегавым Статуце артыкул, які паказвае, што ў тагачасных гарадах мела месца прастытуцыя. У заканадаўстве выкарыстоўваўся тэрмін «паспалітая вшэтэчніца» (распусніца), а «вшэтэчэнства» азначала распусту. З пункта гледжання заканадаўства, важную ролю ў распаўсюджанні прастытуцыі адыгрывалі зводніцы і зводнікі. Дзяржаўным урадн ікам і гарадскім уладам прадпісвалася караць іх абразаннем вушэй, носа і вуснаў і выганяць з горада. А калі чалавека без вушэй і носа другі раз лавілі за амаральным рамяством, тады ўжо каралі смерцю. Праўда, мужчыны, якія карысталіся паслугамі прастытутак, не падлягалі пакаранню і не разглядаліся як асобы, якія вінаватыя ў распаўсюджанні прастытуцыі.

Артыкулы, якія рэгулявалі сэксуальная дачыненні, у асноўным былі завязаны на маёмасць. Яны павінны былі прымусіць шляхту паводзіць сябе больш прыстойна. Аднак ні адзін артыкул не прадпісваў дзяўчатам выходзіць замуж нявінніцай. Яны не прадпісвалі пазбягаць сэксу ў святочныя дні, пасты, сераду, пятніцу, суботу. За гэтым павінна была сачыць царква. На дзяржаўных чыноўнікаў не ўскладаліся такія абавязкі.

**Наталля Сліж**

## ПОШТА РЭДАКЦЫІ

### Тадэвуш Малевіч: Не трэба мяне вучыць павазе да беларусаў

**У №27 «НН» ад 21 ліпеня надрукаваны артыкул Сяргея Мікулевіча «Грунвальд крэсовы».** У ім ён піша пра «прыкрасці» і «памылкі», якія, на яго думку, дапушчаны пры афармленні памятнай дошкі да 600-годдзя Грунвальдскай бітвы.

Я з'яўляюся аўтарам гэтай дошкі, і я яе кампанаваў. Цяжка ўявіць сабе на ёй два тэксты — на польскай і беларускай мовах. Зразумела, што вельмі хочацца, але ёсць пэўныя патрабаванні да кампанавання памятных дошак. Пачуццё ладу і прапорцый не дае ўціснуць на гэту дошку яшчэ адзін тэкст. Не ў гэтым трэба праяўляць патрыятызм і чуйнасць.

Не трэба мяне вучыць павазе да беларусаў. Я іх паважаю і нават люблю. За некаторым, нешматлікім, зрэшты, выключэннем.

Мікулевічу варта было б «паразважаць» на іншую тэму — калі гэта беларусы будуць шанаваць сваю гісторыю, спадчыну і гістарычную памяць? Маглі б здабыцца нават і на велічны помнік (усёй дзяржавай) годнай перамогі ў векапомнай бітве і геraічных продкаў. Або хаця б на памятную дошку на беларускай мове, а не абражаць іншых. Тых, хто, хаця і на польскай мове, але годна ўвекавечылі памяць аб сумеснай перамозе сваіх — і польскіх, і беларускіх — продкаў.

Паверх маёй дошкі Мікулевіч можа павесіць сваю — на беларускай мове. Тады, можа, і я знайшоў бы за што яго пакрытыкаваць або павучыць. Крытыкаваць заўжды лягчэй, ніж зрабіць штосьці карыснае самому.

«Доўгія разважанні» сп. Мікулевіча маглі б быць карацейшымі, калі б ён супаставіў слова «litewskich XV.VII.MCDX на дошцы. Каб тое, што напісана на памятнай дошцы, «было зразумела ў нашы часы», трэба вучыць сваёй гісторыі грамадства, а не ператвараць дошку ў старонку з падручніка.

Разважанні сп. Мікулевіча былі б яшчэ карацейшымі, калі б ён уважліва разгледзеў на дошцы стылізаваны, хаця гістарычна не зусім дакладны (бо з больш позняга часу), але аддаючы дух братэрства зброі і народаў, сумесна польска-літвінскі («litewski») герб — польскага Арла і літвінскую «Пагоню». Звярнуўшы ўвагу на хвост каня, ён зразумеў бы, аб якіх «літоўцах» сведчыць дошка.

Характэрна і сумна аднач асова, што сп. Мікулевіч не знайшоў ніводнага добрага слова ні аб дошцы, ні аб тых, хто яе ўсталяваў. Ратуючы, хаця б на польскай мове, гонар дзяржавы. І Мікулевіча. Але яму ў сваёй зацятасці гэтага не зразумець.

**Тадэвуш Малевіч, Гродна**

**Ад Рэдакцыі.**

Дзякуй за водгук і за ўвагу да гісторыі. І за «беларускі» хвост каня «Пагоні» асобны дзякуй. Але ў каментары «НН» нагадвала, што беларуская мова мусіць прысутнічаць у публічнай прасторы, а беларусы — называцца беларусамі. Права фундатара — выбіраць мову таблiцы. Але адну мову. Другая ў Беларусі мусіць быць беларускай. Так як у Польшчы адна мова заўжды будзе польскай. А палякі — палякамі.

# «Усе за стол!»

Лявон Вольскі расказвае пра новы сінгл.

Абноўлены склад «Крамбамбулі» выпускае максі-сінгл «Раз, два, тры — усе за стол!» За тыдзень да з'яўлення альбома ў інтэрнэце Лявон Вольскі расказаў «Нашай Ніве» пра новыя песні, карпаратывы і кліп з удзелам пасла Швецыі Стэфана Эрыксана.

**— Што ўвойдзе ў сінгл?**

— Гэты сінгл прэзентуе новую «Крамбамбулю», цяпер мы бліжэй да стылістыкі поп-панка ці нават фольк-панка. Песні без падтэкстаў, без моцнага канцэпту, такія «дурнаватыя» — проста людзі дзяцінацца. Галоўная песня — «Раз-два-тры — усе за стол!», але галоўная не таму, што самая хітовая, а таму што больш за ўсё падыходзіць для назвы інтэрнэт-сінгла. На яе будзем здымаць кліп, я выступлю ў ролі тамады, у якасці гасцей пасадзім усялякіх знакавых асобаў, напрыклад, Стэфана Эрыксана, калі ён пагодзіцца.

**— А Вам што, сапраўды даводзілася выконваць абавязкі тамады, напрыклад, на вяселлях у сяброў?**

— Тамадой я не быў, але падчас карпаратываў «Крамбамбулі» «тамажу» патрошку — мы ж ніколі не іграем «ад званка да званка, прайшла гадзіна — да пабачэння». Мы ставімся творча і да карпаратываў. Бывае такая публіка інертная, нават на вяселлях, што яны сядзяць і п'юць, але іх жа трэба падняць. Таму іх варта трошкі правакаваць, нават кпіць, толькі тады яны падымаюцца, так што лёгкая «тамадатасць» прысутнічае.

**— А падрабязней раскажаце пра песні?**

— «Раз-два-тры, усе за стол» — гэта раней былі такія брутальныя прыпеўкі, пад акампанемент баяна ці акардэона, якія спяваліся, каб сабраць гасцей за стол — калі ўсе разыходзіліся папаліць ці былі занятыя размовамі. Я ўжо ляпнуў, што такім чынам мы адраджаем беларускія вясельныя традыцыі — я жартаваў, між іншым, — але мне ўжо напісалі ў каментарах: «Хіба гэта традыцыя?» Ну, якія-ніякія, але брутальныя і смешныя традыцыі. Другая песня называецца «Азалаціцца», і яе персанаж таксама досыць брутальны, ён прагне хуткага ўзбагачэння — «Пакуль Зямля наша будзе круціцца, кожнаму хочацца азалаціцца». А куплеты простыя, кшталту «хочацца гэтага, хочацца таго». Трэцяя песня называецца «Свята кожны дзень», яе тэкст стылізаваны пад народны. І напачатку планавалася і музыку зрабіць а-ля беларуская народная, але выйшла па-іншаму. З нейкім ірландскім каларытам. Вось такія тры жыццесцвярджальныя вясёлыя песні, а не сумныя пра «зямельку нашу гаротную» і скрушны лёс беларускага народа.

**— У «Крамбамбулі» новы склад. Ці адрозніваецца праца з новымі музыкантамі ад працы з папярэднім складам?**

— Новы склад — гэта іншы склад, а таму і працуецца нам зусім па-іншаму. Пакуль што мы працуем менш за год, і ўсё гэта адбываецца весела, такі «мядовы месяц».

**— Кажуць, у «Крамбамбулі» з'явіцца шэраг новых інструментаў?**

— Новыя інструменты з'явіліся, але на сінгле іх яшчэ не будзе — затое іх можна будзе пачуць на фестывалі «Навальніца» ў Лагойску, і там будуць нават такія інструменты, як электра-сітар.

**— А ці плануецца паўнавартасны альбом?**

— Пра планы разважаць я не люблю — яны ўвесь час змяняюцца. Літаральна сёння з'явілася некалькі новых ідэй, з якімі хочацца працаваць, але гэта пакуль сакрэт. Наконт альбома... Чакайце новых сюрпрызаў напрыканцы верасня.

**— «Раз-два-тры...» — інтэрнэт-сінгл. Як Вы лічыце, ці ёсць будучыня ў CD-фармата?**

— Ён адмірае, хутка ўсё канчаткова пяройдзе ў інтэрнэт. Прынамсі, ніхто з маіх знаёмых не купляе ліцэнзію ў Беларусі. Продажы ж страшэнна зменшыліся ва ўсім свеце, а наша індустрыя продажу дыскаў і падняцца ж не паспела. А ўвогуле ва ўсіх гэтых працэсах нічога страшнага няма, наадварот, гэта лепш за застой.

**— А ці будзе ў сінгла асобная прэзентацыя?**

— Прэзентацыя будзе ўвесь час на канцэртах. Вось песня «Раз-два-тры — усе за стол!» мне падаецца добрай фінальнай для карпаратываў. І на карпаратывах людзей трэба патрошку прывучаць да цяжэйшага гучання.

**Юрась Ускоў**




**— Наконт карпаратываў, самы незвычайны, на якім вам даводзілася выступаць?**

— Адна кантора, якая займаецца металам, зняла пад карпаратыў увесь гарнальыжны лагойскі цэнтр, цалкам. Усё гэта было стылізавана пад толкіенаўскага «Уладара пярсцёнкаў», там былі і хобіты, і гномы, якіх выпісалі аднекуль з Растова — там у іх нейкі клуб ёсць, яны ўсе тоўстыя і маленькія. Эльфы ў белых убраннях плавалі ў чаўнах па вадзе... Хобіты жылі ў Хабітоне сярод качак і гусей... Карацей, там усё было.




**10—11 жніўня ў Навагрудскім раёне прайшоў хросны ход, прысвечаны Дню адраджэння Лаўрышаўскага манастыра. Манастыр месціцца на беразе Нёмана, каля вёскі Гнесічы. Ён адзін з самых старажытных у Беларусі, заснаваны каля 1225 года. Яго заклаў сам князь-манах Войшалк, сын караля Міндоўга. У 1258 годзе на Наваградскую зямлю напаў хан Бурундай і Войшалк (іншае імя Лаўрыш — адсюль і назва манастыра) узначаліў апалчэнне, каб адбіць ворага. З 1264 па 1267 гады ён быў вялікім князем літоўскім, аднак у 1267-м канчаткова сышоў у манаства. Хоць ён і быў манахам, аднак падзяліў лёс многіх сваіх аднагодкаў-рыцараў: яго забілі па невядомых прычынах.**

IN MEMORIAM

## «Свядомы беларус, наш чалавек»

Памёр Вячаслаў Дубінка — фатограф «Звязды», адзін з удзельнікаў незалежніцкага паўпадполля 1970—1980-х. Пра яго ўспамінае мастак **Уладзімір Крукоўскі**.




Гэта быў унікальны для Беларусі чалавек. Свядомы беларус, наш чалавек. Добры, разумны, камунікабельны, шчодры. Цесна звязаны з легендарнай майстэрняй «На Паддашку» Яўгена Куліка. На яго можна было спадзявацца ў любой справе, у якой ён ведаў толк.

А ўнікальнасць ягоная ў тым, што няма ў Беларусі чалавека, які б адначасова належаў да чатырох творчых суполак. У 1960-я ён са слуцкай раёнкі фатографам перайшоў у «Звязду», далучыўся да Саюза журналістаў. Абʼехаў усю краіну.

Фатаграфаванне ў яго паралельна ішло з напісаннем артыкулаў, нарысаў. Як майстар выцінанкі ў тых жа 1960-х прыйшоў у Саюз мастакоў і Саюз народных майстроў. Вячаслаў вярнуў беларускую выцінанку з нябыту. Спачатку ён прыглядаўся да дзейнасці ўкраінскіх майстроў, а потым за якія 10 гадоў і сам стаў прызнаным майстрам. Ягонымі выцінанкамі ілюстраваліся літаратурныя творы. Напрыклад, кніга Артура Вольскага «Жывыя літары». Пайшлі выставы. У Музеі сучаснага мастацтва, у Нацыянальным мастацкім, за мяжой. Замежнікі ахвотна набывалі ягоныя выцінанкі.

Чацвёртым ягоным творчым саюзам стаў Саюз пісьменнікаў. Вячаслаў — аўтар шасці аповесцяў. Першая — «Не плач, мая душа» — была надрукаваная ў часопісе «Маладосць».

Цяжка пра Славу гаварыць у мінулым часе. Яшчэ пяць дзён таму бачыліся з ім у ягонай майстэрні. Ён проста поўніўся планамі. Падрыхтаваў да друку пры ўдзеле Уладзіміра Басалыгі макет новага альбома выцінанак. Не дачакаўся новай аповесці ў выглядзе кнігі, яна пакуль у электронным варыянце.

Развіталіся з Вячаславам Дубінкам 12 жніўня. Пахавалі яго на Паўночных могілках.

**Запісаў Сямён Печанко**

### Сцісла

**• 60 гадоў споўнілася Леаніду Галубовічу.** Электрык па спецыяльнасці, ён стаў адным з найлепшых беларускіх паэтаў. Пісаў да 2000 года. Апошнія гады Галубовіч працуе ў газеце «Літаратура і мастацтва», дзе выступае ў ролі крытыка і эсэіста пад псеўданімам ЛеГал.

**• Выйшаў другі нумар часопіса «Верасень».** Увазе чытачоў прапануюцца вершы Валерыі Куставай, Марысі Сушы, Паўла Баяркі, Алеся Плоткі, Аліны Кузьміч ды іншых маладых літаратараў.

**• Незвычайная кніга пра Мір.** Замак — не адзінае, чым можа пахваліцца гэтае мястэчка. Мір на працягу стагоддзяў убіраў у сябе ўсё тое, што адбывалася на беларускай зямлі. Гэтае невялікае мястэчка — як маленькі адбітак Беларусі. Даследчыцы Ірына Махоўская і Ірына Раманава выдалі кнігу, складзеную з успамінаў аб Міры колішніх яго жыхароў. З кнігі можна даведацца, як местачкоўцы рэагавалі на першага ўбачанага мурына, якога прывёз у Мір князь Святаполк-Мірскі, чаму яны так не залюбілі жонку новага ўладальніка замка і за што ўзненавідзелі савецкую ўладу.




**• Выйшла кніга Навумчыка і Пазняка «Дэпутаты Незалежнасці».** Яна апублікаваная ў варшаўскім выдавецтве «Беларускія ведамасці». У ёй адлюстраваныя падзеі 1990—1991 гадоў, і яна прымеркаваная да 20-годдзя абвяшчэння незалежнасці Беларусі. Са слоў Сяргея Навумчыка, ім з Зянонам Пазняком «падалося мэтазгодным разбурыць некаторыя міфы, якія ўзніклі за апошнія гады». «Напрыклад, пра тое, што Захад нібыта падтрымліваў памкненне савецкіх рэспублік да суверэнізацыі (насамрэч актыўна і паслядоўна перашкаджаў), ці што Станіслаў Шушкевіч быў прыхільнікам незалежнасці», — сказаў Навумчык.

**МБ; Алесь Пілецкі**

# «Трымайцеся моцна. Ваш Хаім»

Пры паляках — у падполлі, пры немцах — у гета і ў партызанах, пры саветах — у загатканторы. Такі лёс Хаіма Александровіча і тысяч яго супляменнікаў. Піша **Андрэй Вашкевіч**.



**Сям'я Александровічаў на здымку, зробленым у снежні 1940. З дзесяці чалавек вайну перажыў толькі адзін Хаім (на здымку сядзіць злева).**

Прызнацца, так і не паглядзеў фільм Эдварда Цвіка «Выклік», прысвечаны гісторыі партызанскага атрада братоў Бельскіх, аднак некалькі кніг аб дзейнасці гэтага падраздзялення, што стала знакамітым, давялося прачытаць. Не хачу брацца ўдзелу ў палеміцы аб ролі атрада ў гісторыі антыфашысцкага змагання ў Беларусі. Калі чую пра Бельскіх, успамінаю пра іншых беларускіх яўрэяў, пра якіх не надта гавораць цяпер і пра якіх, мабыць, ніколі не здымуць фільмаў. Маю на ўвазе актывістаў Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі — яўрэяў па паходжанні. Іх роля як у беларускай гісторыі наогул, так і ў перамозе над фашызмам канкрэтна, куды больш значная.

Згадаю тут хоць бы Хаву Кручкоўскую, якая ўвайшла ў беларускую гісторыю як Аляксандра Бергман, — аўтарку кніг пра Браніслава Тарашкевіча і жыццё беларусаў у міжваеннай Польшчы; Фаню Цыгельніцкую — маці Іны Карпюк, вядомага беларускага педагога і жонкі гродзенскага пісьменніка Аляксея Карпюка; Гірша Смоляра — аднаго з арганізатараў мінскага антыфашысцкага падполля, які ў 1935 г. палемізаваў з ксяндзом Адамам Станкевічам на старонках віленскага «Калосся». Сёння хочацца распавесці пра Хаіма Александровіча.

Ён паходзіў са знакамітай у Гродне рабочай яўрэйскай сям'і. Ужо на пачатку 1920-х разам са сваімі чатырма братамі далучыўся да КПЗБ і, працуючы на розных гарадскіх прадпрыемствах, удзельнічаў у рабочым руху. Як успаміналі ягоныя паплечнікі, Хаім спецыялізаваўся на начным вывешванні чырвоных сцягоў, паколькі надта добра ўмеў караскацца па тэлеграфных слупах. У той час у Гродне актыўна разгортваўся камуністычны рух, у якім удзельнічалі як яўрэі, так і беларусы. Браты Александровічы былі ў ліку яго лідэраў і перыядычна траплялі ў польскую турму. Бывала часам так, што чацвёра з пяці братоў адначасова сядзелі ў турме.

Хаім перайшоў савецкую мяжу і прайшоў падрыхтоўку ў камуністычнай ВНУ. Перакінуты назад у Заходнюю Беларусь, ён працаваў уже як сакратар аднаго з аддзелаў Цэнтральнага Камітэта КПЗБ, аднак хутка быў арыштаваны і на некалькі год трапіў у турму. Вызвалілі яго па амністыі незадоўга да пачатку Другой сусветнай вайны.

Перыяд ад восені 1939-га да лета 1941-га быў, мабыць, самым спакойным часам у жыцці Хаіма Александровіча.

У чэрвені 1941-га разам з сям'ёй Александровіч рушыў на ўсход. Аднак немцы занялі Мінск раней, чым туды дабралася група гродзенскіх бежанцаў. Партыйнае начальства фактычна ўцякло з горада. «Насельніцтва горада, і найперш восемдзесят тысяч яўрэяў, было пакінута на «міласць» ворага. Паніка сярод кіраўніцтва была такая вялікая, што яно нават не паспела прызначыць некалькіх чалавек, якія павінны былі застацца ў вобласці для арганізацыі руху супраціву. Мінскі абкам, які быў створаны пазней, ніколі не наведваў горад», — пісаў Гірш Смоляр.

Між тым, на руінах спаленага Мінска разгортвалася трагедыя. У жніўні—лістападзе 1941 года фашысты арганізавалі каля дзясятка аблаваў, у якіх загінула прыкладна 30 тысяч яўрэяў. Сярод іх былі маленькая дачка і жонка Хаіма Александровіча. Яго сына задушылі падчас адной з аблаваў, каб ён сваім плачам не выдаў групу яўрэяў, якія хаваліся ад фашыстаў...

Александровіч быў у ліку першых, хто пачаў арганізоўваць у гета рух супраціву. Разам з сябрамі ён збіраў зброю і адпраўляў яўрэйскія групы ў партызанскія атрады. Было гэта няпроста: знайсці зброю ў горадзе было амаль немагчыма, а ў першыя партызанскія атрады без зброі не прымалі. Больш таго, з гета трэба было спачатку вырвацца, а пасля даказаць партызанам свае намеры рэальна змагацца з ворагам.

Александровіч выйшаў на чале адной з апошніх груп, якая зімой 1942 года пакінула мінскае гета. Пазней ён пісаў: «Я выйшаў з Мінска з групай 18 чалавек і 8 наганаў. Аднаго згубілі ў дарозе — замерз. 12 сутак амаль не спалі, галадалі. Людзі адмарожвалі рукі і ногі. Навокал немцы. Я адмарозіў пальцы на нагах. Сілай прымусіў сябра-лекара адкусіць кравецкімі нажніцамі кавалак пальца, што гніў. Загаіўся толькі на пятым месяцы. Ноччу напалі на невялікі нямецкі гарнізон, забілі 11 салдат і афіцэраў, узброіліся кулямётамі і вінтоўкамі. Папілі партвейну і паелі масла і канцэнтратаў. Умацаваліся фізічна і вайскова. Знішчылі ўсе валасныя ўправы немцаў і іх ганізоны ў шэрагу раёнаў. Вялікі карны атрад акружыў нас, узарваў наш лагер і загнаў у балота. Харчаваліся канінаю без хлеба і солі тры тыдні. У выніку марозу, голаду, куляў і вісельняў нямецкіх карнікаў са 120 чалавек да пачатку мая 1942 года нас засталося 17».

Тое быў толькі пачатак партызанскага шляху Хаіма Александровіча. Хутка рэшткі ягонай групы далучыліся да атрада «Народныя мсціўцы» дзядзькі Васі» — маёра Васіля Варанянскага.

Падчас адной карнай аперацыі атрад быў акружаны ў некалькі разоў большай групоўкай немцаў. Сярод партызанаў пачалася паніка, і тыя было пачалі ўцякаць. Сітуацыю выратаваў Александровіч, які, сеўшы за кінуты кулямёт, адстрэльваўся, пакуль партызаны не змаглі перагрупавацца і арганізавана даць адпор карнікам. Пасля гэтага, праходзячы перад шэрагам партызан, дзядзька Вася заўсёды спыняўся перад Александровічам, паціскаў руку і гаварыў з ім. Напярэдадні вызвалення Хаім Александровіч ужо быў камісарам брыгады Варанянскага, аднаго з найбольш баяздольных злучэнняў беларускіх партызан, якое налічвала больш за 1500 чалавек.

«Плямы» ў біяграфіі (яўрэйская нацыянальнасць, паходжанне з Заходняй Беларусі і сяброўства ў знішчанай Сталінам КПЗБ) прывялі да таго, што пасля вызвалення Мінска Хаім быў прызначаны шараговым забеспячэнцам у адной сталічнай канторы. І гэта нягледзячы на партыйны стаж з пачатку 1920-х, вышэйшую адукацыю і бясспрэчныя заслугі падчас вайны.

Пасада, на якой трэба было крывадушнічаць, даваць хабар, яму не пасавала. Усяго гэтага сумленны заходнебеларускі камуніст не ўмеў і не хацеў рабіць. Александровіч на свае вочы назіраў прафанацыю ідэалаў, за якія яму столькі давялося адпакутаваць і ў міжваеннай Польшчы, і ў партызанцы. Разгортваўся ў СССР і антысемітызм, які неадназразова дэманстраваў сябе яшчэ ў партызанскім асяроддзі. Яўрэяў не вылучалі на адказныя пасады, яўрэйскіх хлопчыкаў-сірот не бралі ў вайсковыя вучэльні, найлепшых дзеячаў яўрэйскай культуры амаль адкрыта забівалі.

Спробы Смоляра, Александровіча і іншых лідэраў мінскага падполля неяк палепшыць жыццё яўрэяў, што вярталіся ў горад пасля гадоў у партызанскіх атрадах, нічога не давалі. Больш за 5 тысяч чалавек (усяго з мінскага гета вырвалася каля 10 тыс. яго вязняў, гэта ўнікальная для гісторыі еўрапейскага супраціву лічба) вымушаны былі займацца дробным гандлем, не маючы іншых сродкаў да існавання, не мелі ніякага жытла.

«Нікога са сваіх, нікога з блізкіх. Бацька мой «памёр» самай натуральнай смерцю. Я гэтаму «рады», бо ён не бачыў усіх жахаў знішчэння людзей. Брат Янкель памёр на 6-ы дзень вайны пасля цяжкага ранення... Усе астатнія былі па-зверску знішчаны... Усяго з Гродна выратавалася дзясяткі два людзей», — пісаў Александровіч сваёй знаёмай, апісваючы ўражанні ад свайго візіту ў роднае Гродна. Завяршаўся ж ліст нязменна аптымістычным: «Трымайцеся моцна. Ваш Хаім».

Пазней ён перабраўся ў Вілейку, дзе працаваў забеспячэнцам спіртавога трэста, дырэктар якога, таксама яўрэй, хваліўся тым, што ў гады калектывізацыі саслаў свайго бацьку ў Сібір, абвесціўшы яго кулаком.

Неяк у пачатку 1948 г. Александровіч вяртаўся цягніком з Гродна ад свайго партызанскага сябра Баляслава Ротблята. У Маладзечне яму стала дрэнна. Пасажыры дапамаглі зайсці ў будынак вакзала, аднак міліцыянер выгнаў яго адтуль, заўважыўшы, што п'яніцам тут не месца. Пасля ночы на марозе Хаім Александровіч быў поўнасцю паралізаваны і, некалькі месяцаў прамучыўшыся ў бальніцы, памёр 7 сакавіка 1948 г.

У дзень яго пахавання ўсё вілейскае начальства пайшло на святочныя мерапрыемствы з нагоды «жаночага дня». Нешматлікія саслужыўцы, што былі на хаўтурах, дзівіліся, даведаўшыся ад сяброў Хаіма, якое жыццё пражыў сціплы забеспячэнец спіртавога трэста.

Сёння у Вілейцы, напэўна, няма нават яго магілы.

# Як зрабіць першае спатканне лепшым

Адзінокія, незанятыя, вольныя — назавіце іх як хочаце — марацць выйсці з зачараванага кола бясконцых спатканняў з патэнцыйнымі партнёрамі, але неяк неўсвядомлена ператвараюць пабудову інтымнай сувязі ў цяжкую працу. І гэтым адно адпалохваюць другую палоўку. Мы раскажам пра пашыраныя памылкі падчас першай сустрэчы і як тыя памылкі выправіць.

### Памылка № 1. Пошук прынца (прынцэсы)

Мы засяроджваемся на пошуках Аднаго-Адзінага (Адной-Адзінай), адпрэчваем патэнцыйных прэтэндэнтаў праз другасныя прычыны і маем схільнасць разрываць кантакт пры першай узніклай праблеме.

Што рабіць? Не патурайце міжвольнаму імпульсу знайсці ў новым партнёру заганы, хібы і хібкі. Можна ж глянуць на паўпустую шклянку інакш: адзначыць сабе перавагі і вартасці чалавека і знайсці ў іх патэнцыял для працягу.

### Памылка № 2. Разрыў сувязі без прычыны

Боязь быць адрынутым шмат у якіх выпадках вымушае чалавека наносіць заўчасны, папераджальны ўдар. Памятайце! Каханне — гэта не бокс!

### Памылка № 3. Пустыя чаканні

Падчас першых спатканняў людзі, настроеныя сур'ёзна, часцяком унікаюць тлумачэнняў, чаго яны чакаюць ад будучай рамантычнай сувязі. А потым высвятляецца, што іх партнёр увогуле хацеў лёгкага флірту. Усё гэта вядзе да балючых перажыванняў. Таму не саромейцеся пра рэчы, важныя для вас, сказаць ужо на першым спатканні.

Прыгадайце (хаця б намёкам) пра вашы каштоўнасці, пра вашы чаканні ад сувязі — у большасці выпадкаў вас зразумеюць. Памятайце, гутарка — надзейны шлях высветліць ужо на першым спатканні, ці супадаюць вашыя чаканні з чаканнямі іншага чалавека.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Гэтым летам можна прызначыць спатканне ў фантане. Такое дакладна запомніцца.

### Памылка № 4. Адсутнасць пазітыўнай энергіі ды ініцыятывы

Выйдзіце з дому такі, які вы ёсць, — вы не машына для спатканняў. Вылічыце наперад атмасферу спаткання (уважлівае слуханне адно аднаго, весялосць і да т.п) і падумайце, што вы будзеце рабіць, каб стварыць яе. Каб стварыць шчырасць, якая ўрэшце прывядзе да глыбокага знаёмства з чалавекам, хтосьці з дваіх павінен узяць ініцыятыву на сябе. Чаму б не вы?

### Памылка № 5. Параўнанне з мінулымі партнёрамі

На першае спатканне мы нясём усю сваю крыўду, усе пралікі мінулага, уключна з успамінамі пра нашых былых, якія расчаравалі, кінулі і г.д. Мы сядаем насупраць новага чалавека і глядзім на яго праз фільтр мінулага, вачыма вечна пакрыўджанага. Жывіце цяперашнім! Можна ж адолець чорную паласу. І спярша паспрабуйце паставіцца да чалавека, які сядзіць насупраць вас, так, як бы вы хацелі, каб ён абышоўся з вамі. Паверце, гэтая пачвара, няшчаснае каханне, не палюе асабіста на вас!

**Сямён Цыбульскі**

ЗДАРОЎЕ

## Беларусы — самыя тоўстыя сярод жыхароў СНД

63,7% мужчын і 69,9% жанчын у Беларусі маюць лішнюю вагу.

СААЗ вызначае індэкс масы цела чалавека (ІМЦ) як вынік дзялення вагі ў кілаграмах на ўзведзены ў квадрат рост у метрах. Па стандартах СААЗ, калі ІМЦ роўны або большы за 25, гэта залішняя вага, а калі роўны або большы за 30 — атлусценне. Напрыклад, пры росце 1,7 м і вазе 83 кг ІМЦ складзе 83 / (1,7*1,7), то бок 28,7 — гэта залішняя вага.

Першыя чатыры месцы ў свеце па долі насельніцтва, старэйшага за 15 гадоў, якое пакутуе на залішнюю вагу, займаюць астраўныя дзяржавы Науру (96,9% мужчын і 93% жанчын), выспы Кука (93,4 і 90,3%), Мікранэзія (93,1 і 91,1%) і Тонга (91,4 і 92,1%). Ва ўсіх гэтых краінах найбольшы працэнт хворых на дыябет, які набыў маштаб нацыянальнай хваробы.

У Науру доля грамадзян з надмернай вагой складае 84,6% сярод мужчын і 80,5% сярод жанчын.

У Еўропе самае важное насельніцтва ў Грэцыі і на Мальце.

У Грэцыі доля мужчын з залішняй вагой складае 77,5%, жанчын — 63,2%, на Мальце — 73,3 і 67,6% адпаведна. У той жа час, сярод мальтыйцаў больш тых, хто пакутуе на атлусценне: 28,1% мужчын і 36,5% жанчын. На атлусценне пакутуюць 30,3% грэкаў і 26,4% грачанак.

Сярод краін былога СССР па паўнаце насельніцтва першая — Беларусь: 63,7% мужчын і 69,9% жанчын маюць залішнюю вагу, а 32,2% жанчын і 16,2% мужчын — атлусценне.

Расія па долі і мужчын, і жанчын з залішняй вагой займае 99-е месца сярод 192 краін свету. Па дадзеных СААЗ, 46,5% расійскіх мужчын і 51,7% жанчын маюць залішнюю вагу. На атлусценне пакутуюць 9,6% мужчын (93-е месца) і 23,6% жанчын (74-е месца).

Самай «худой» краінай свету можна назваць Эрытрэю: усяго 3,5% мужчын і 6,3% жанчын там маюць залішнюю вагу, а на атлусценне пакутуюць толькі 0,1% жанчын. Краіна яшчэ нядаўна пакутавала ад голаду.

**«Салідарнасць»**

## Ад плэераў дзеці глухнуць

Кожны чацвёрты малодшы школьнік кепска чуе. І вінаватыя ў тым mp3-плэеры.

Раней страту слыху выклікалі ў асноўным інфекцыі і траўмы, а сёння дзеці правакуюць яе самі, слухаючы гучную музыку праз навушнікі, сцвярджае Крыстофер Каханак, каардынатар даследавання з польскага Інстытута фізіялогіі і паталогіі слыху.

Аўтары даследаванняў наведалі вясковыя школы. Вынікі апытанняў паказалі, што толькі палова бацькоў дзяцей з недахопамі слыху, пры якіх трэба насіць слыхавы апарат, ведала аб праблеме да візіту навукоўцаў.

Дзеці з недахопамі слыху горай разумеюць настаўніка. Тым не менш, яны саромеюцца перапытваць і не хочуць сядзець на першай парце, а праблемы растуць, кажа доктар Каханак.

Праз праблемы са слыхам дзяцей складаней навучыць чытаць.

**Gazeta.pl**

КАЛЬКУЛЯТАР

## Свіны грып каштаваў мільярды еўра

Вялікая памылка Сусветнай арганізацыі аховы здароўя дорага абышлася.

Праз год пасля першай успышкі свінога грыпу Сусветная арганізацыя аховы здароўя абвясціла пра канец пандэміі. Кіраўніцтва арганізацыі запэўніла, што вірус больш не ўяўляе пагрозы, і прызнала, што пандэмія аказалася нашмат менш небяспечнай, чым чакалася.

Пандэмія каштавала падаткаплатнікам ва ўсім свеце мільярды еўра. Французы замовілі вакцыны на 860 млн еўра, немцы — на 417 млн, нідэрландцы — на 300 млн, а італьянцы — на 184 млн еўра. На выплаты дактарам і медсёстрам, што працавалі ў непрацоўны час, адна Францыя выдаткавала 150 млн еўра. Яшчэ 95 млн пайшло на арэнду складаў, 8,5 млн — на шпрыцы, а 6 млн — на інфармацыйную кампанію.

Прышчэпкі зрабілі толькі 5% французаў. Ненашмат лепей было ў іншых краінах. На прышчэпкі пагадзіліся 4% італьянцаў, 10% немцаў, 20% амерыканцаў і 25% брытанцаў. Гэта тлумачыцца тым, што грып аказаўся менш небяспечны, чым казалі эксперты СААЗ.

Годам раней СААЗ абвясціла, што ад свінога грыпу можа памерці аж да 7 млн чалавек. Насамрэч памерла каля 18,5 тыс. чалавек. Для параўнання: падчас сезоннай эпідэміі грыпу штогод памірае да 0,5 млн. У краінах засталася каласальная колькасць нявыкарыстанай вакцыны.

З нагоды памылкі СААЗ Парламенцкая асамблея Рады Еўропы правяла расследаванне і выявіла, што рашэнне СААЗ пра абвяшчэнне пандэміі было неабгрунтаваным.

**СГ**

ЧАЛАВЕК І ПРЫРОДА

## Эксперт: ласі выратуюцца ад расійскіх пажараў у Беларусі



Расійскія ласі, казулі і дзікі вымушана шукаюць паратунку ад пажараў на тэрыторыі Беларусі, выказаў здагадку ў інтэрв'ю «Інтэрфаксу» кіраўнік раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці Васіль Кастроў. Па словах эксперта, «корму хопіць на ўсіх», таму міграцыя жывёл з Расіі не створыць «ніякага экалагічнага прэсінгу» ў беларускіх лясах.

Кастроў, аднак, адзначыў, што лісы і зайцы наўрад ці выратуюцца ад агню.

**СМ**

І ТАКОЕ БЫВАЕ

## У Омскай вобласці ў пельменях знайшлі сібірскую язву

У Омскай вобласці і Ханты-Мансійскай аўтаномнай акрузе Расіі ў пельменях «Особенные» (прадукцыя ТАА «Дарина») знойдзеная сібірская язва.

«Улічваючы сітуацыю, упраўленнем Расспажыўнагляда па Омскай вобласці быў выдадзены загад аб вяртанні з гандлёвай сеткі мясных паўфабрыкатаў, выпрацаваных у перыяд з 13 ліпеня па 11 жніўня», — заявілі ў прэс-службе ўпраўлення.

**LifeNews**

## КАНЦЭРТЫ



**J:морс**

**19 жніўня а 20-й у Chillout cafe U2 (вул. Арлоўская, 80)** — канцэрт гурту «J:морс» з акустычнай праграмай пад адкрытым небам.

**Джаз у Палацы Рэспублікі**

**22 жніўня на Малой сцэне Палаца Рэспублікі** — канцэрт «Успамін пра боскую Шырлі Хорн». Адна з найлепшых джазавых спявачак ЗША Шарон Кларк выступіць у суправаджэнні мінскага гурту «Apple Tea». Музыкі створаць на сцэне атмасферу старога, традыцыйнага джаза.

## ФУТБОЛ

**Ліга Еўропы ў Барысаве**

**19 жніўня** барысаўскі БАТЭ дома правядзе першую гульню раўнду плэй-оф Лігі Еўропы. Супернік — каманда «Марыціму» з партугальскай выспы Мадэйра. **Пачатак а 19.00.** Білет — 10 тысяч. Дзіцячы — 5000. Пераможца пары трапіць у групавы этап Лігі Еўропы. Таксама ў гэты дзень мінскае «Дынама» ў Бельгіі пазмагаецца з мясцовым «Бругe», а магілёўскі «Дняпро» ў Іспаніі — з «Вільярэалам».

## ВЫСТАВЫ

**«Песняры». Раскрытае сэрца**

**У Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры (зав. Музычны, 5) да 1 верасня** праходзіць выстава «Песняры». Раскрытае сэрца», на якой прадстаўленыя нотныя рукапісы У.Мулявіна, фотаздымкі, афішы, конкурсныя прызы, дыпломы і сцэнічныя касцюмы «Песняроў».

**«Карціна алеем»**

**У галерэі сучаснага мастацтва «Ў» (пр. Незалежнасці, 37а) ад 28 жніўня да 19 верасня** будзе працаваць выстава «Карціна алеем». Фатаграфія, відэа, інсталяцыя, арт-аб’екты і жывапіс алеем — у спалучэнні і ўзаемадзеянні.

**Памяць пра Грунвальдскую перамогу**

**У Гістарычным музеі (вул.Маркса, 12) да 29 жніўня** працуе выстава «Памяць пра Грунвальдскую перамогу», прысвечаная 600-годдзю бітвы пад Грунвальдам.

**Шлях на Грунвальд**

**У галерэі «Універсітэт культуры» (Кастрычніцкая пл., 1)** працуе калектыўная фотавыстава «Шлях на Грунвальд», прысвечаная 600-годдзю вялікай бітвы. У экспазіцыі больш за 60 работ вядомых беларускіх майстроў фатаграфіі.

**Эксперымент**

**У Літаратурным музеі Максіма Багдановіча (вул.Багдановіча, 7а) да 25 жніўня** працуе выстава акварэлі Мікалая Мішчанкі «Эксперымент». Вывучэнне якасцей розных папер і асаблівасцей акварэльнага жывапісу дало магчымасць сабраць шмат аркушаў, частку якіх можна ўбачыць на выставе. Сярод іх эцюды, нацюрморты, пейзажы, выкананыя падчас паездак са студэнтамі на пленэры, вандровак і ў майстэрні.

**Знакі роднай зямлі**

**У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Незалежнасці, 47) да 22 жніўня** працуе выстава габеленаў Наталлі Лісоўскай «Знакі роднай зямлі». Аўтарскія габелены зробленыя ўручную з выкарыстаннем фактуры, а таксама воўны, сінтэтыкі, ільну, шкла, гліны.

**Традыцыі і культура Японіі**

**У карціннай галерэі імя Г.Вашчанкі (вул. Карповіча, 4, Гомель) да 12 верасня** працуе выстава «Традыцыі і культура Японіі». Экспануюцца прадметы культуры і побыту Японіі, а таксама макеты храмаў і замкаў, наборы лялек, паветраныя змеі…

**Неонавая прастора ад «Неонавай галавы»**

**Да 30 жніўня ў Галерэі TUT.BY (вул.Харужай, 1а)** працуе выстава «Неонавая прастора». Экспазіцыя прадстаўленая творамі графікі, жывапісу і скульптуры творчай супольнасці «Неонавая галава».

**Народжаныя морам**

**У мастацкай галерэі Г.Вашчанкі (Гомель) да 20 жніўня** працуе выстава «Народжаныя морам», дзе можна ўбачыць ракавіны разнастайных памераў і колераў, каралы… Усяго больш за 900 экспанатаў.

**Саюз расійскіх мастакоў**

**У Мастацкім музеі (вул.Леніна, 20) да 28 жніўня** працуе выстава «Саюз расійскіх мастакоў. Новы час». На выставе прадстаўленыя 74 творы жывапісу і графікі 35 аўтараў з 14 гарадоў Расіі.

**Паэзія ў будзённасці**

**У Мастацкім музеі да 30 жніўня** працуе рэтраспектыўная выстава жывапісу Барыса Казакова «Паэзія ў будзённасці».

**Гіганты Ледавіковага перыяду**

**У Гістарычным музеі (вул.Маркса, 12) да 29 жніўня** працуе выстава «Гіганты Ледавіковага перыяду». Мадэлі жывёл для выставы адноўлены па шкілетах даўніх вымерлых істот. Для гэтага выкарыстоўваліся сучасныя кампутарныя праграмы з трохмернай графікай. Экспанаты рухаюцца і рыкаюць!

**Беларускія ўзоры**

**У Музеі народнага мастацтва (Раўбічы) да 31 жніўня** працуе выстава «Беларускія ўзоры»: пляценне з прыродных матэрыялаў, кераміка, аплікацыя саломкай, ручная коўка, разьба па дрэве.

**Свет з вышыні**

**У Доме-музеі Ванькоўвічаў (вул. Інтэрнацыянальная, 33а) да 20 верасня** працуе выстава маляваных мапаў Рубена Атаяна «Свет з вышыні».

## КІНО

# Настальгія, якую не стрымаеш

**Тыя, каго не стрымаць** (The Expendables)

ЗША, 2010, каляровы, 103 хв.

**Рэжысёр:** Сільвестр Сталонэ

**Ролі выконваюць:** Сільвестр Сталонэ, Мікі Рурк, Брус Уіліс, Арнольд Шварцнэгер




**Жанр:** Баявік

**Адзнака:** 6 (з 10)

Кампанія наёмнікаў на чале з Барні Росам змагаецца з «кепскімі хлопцамі» па ўсім свеце. Перастраляць самалійскіх піратаў, вызваліць закладнікаў — гэта да Барні Роса. Але аднойчы героям кулака і нажа прапануюць правесці прафілактычную гутарку з адным зацятым дыктатарам...

«Тыя, каго не стрымаць» — настальгічнае тэстастэронавае кіно з залімітна-баявым падборам акцёраў. Галоўны «Рэмба» 1980-х — Сільвестр Сталонэ. Мікі Рурк — стары вяяка з татуіроўкамі і валасамі лапшой. І губернатар-кібарг Арнольд Шварцнэгер, у якога свае хітрыя планы.

У эпоху кампутарных стралялак старая каманда вярнулася на экран, каб жыўцом, без дублёраў, паказаць, як трэба караць нягоднікаў і аднаўляць справядлівасць. Нягледзячы на век акцёраў, удалося зрабіць гэта пераканаўча і энергічна.

**Андрэй Расінскі**



**Фестываль феерверкаў пад Лагойскам**

Другі міжнародны фестываль феерверкаў «Навальніца» пройдзе **27–28 жніўня ў гарналыжным комплексе «Лагойск»**. Свае майстэрства прадэманструюць піратэхнікі з Італіі, Польшчы, Расіі, Украіны, Эстоніі. Завершыць фестываль пазаконкурсны гала-феерверк ад беларускай каманды «Кальвін», чэмпіёнаў Еўропы 2007 года.

Музычную частку фестывалю ўзначаляць гурты «Бі-2» і «Акварыум» з Расіі. На фестываль можна будзе даехаць спецыяльным аўтобусам з Мінска ці сваім аўто (маецца паркоўка на тры тысячы месцаў). Кошт квітка на кожны дзень складае 80 тысяч рублёў. Даведкі і замова квіткоў: (25) 952-45-55 і на сайце www.soundline.by



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Гальшанскі замак**

Год Грунвальда багаты на рыцарскія фестывалі. Свята **ў Гальшанах** пройдзе **21 жніўня**. Сёлета фэст прысвячаецца ажно чатыром датам: 730-годдзю заснавання Гальшанаў, 605-годдзю Соф'і Гальшанскай, 600-годдзю перамогі ў Грунвальдскай бітве і 400-годдзю замка.

Чакаюцца масавыя бітвы рыцараў і ўдзел гуртоў, што граюць старадаўнюю музыку, — будуць **«Стары Ольса», Litvintroll, Testamentum Terrae, «Кеўх Кола»**. Яшчэ ў праграме — турнір лучнікаў, конны турнір, старадаўнія танцы, конкурсы, фаер-шоу.

Фестываль пачнецца аб 11.00 у мястэчку Гальшаны (Ашмянскі раён). Уваход на тэрыторыю свята будзе каштаваць 25 тысяч рублёў. З Мінска арганізуецца даезд на аўтобусах. Даведкі па т.: (029) 677-00-46, (017) 200-04-68.

KM

# Каб жыццё мёдам падавалася

Мінск апанаваны мёдам — яно і зразумела, Мядовы спас, але такое адчуванне, што мядовыя ярмаркі не знікаюць ніколі, а падчас Спаса іх становіцца крыху больш. Кірмашы ўзнікаюць то ў Палацы мастацтваў, то ў ДК Трактарнага завода, ствараючы лішнія клопаты філафаністам і гандлярам кнігамі, якія таксама гандлююць у гэтых месцах. Але цяпер, перад Спасам, мёд аказаўся паўсюль — у метро нон-стопам ідзе рэклама мёду, у кожным прыдатным месцы арганізаваны кірмаш.

У падземным пераходзе на плошчы Якуба Коласа з боку Камароўскага рынку ідуць людзі, у кожнага другога ў руцэ маленькі чырвона-зялёны сцяжок. І дзеці, і пенсіянеры, і людзі сярэдняга ўзросту — амаль у кожнага сцяжок. Адкуль узялося? Паднімаюся да Камароўкі, а там дзяўчаты, адзетыя пчоламі, раздаюць мінакам вось гэтыя самыя сцяжкі.

На Камароўцы праходзіць мядовы кірмаш, і замест бабулек, што гандлююць шкарпэткамі, вазонамі і кацянятамі, вас на ўваходзе сустракаюць дзяўчаты-пчолы. Стаяць яны пад агромністым рэкламным стэндам з двухсэнсоўным надпісам: «Мёд з Кубані. Ліпа!» Іх пчаліны строй у +35 глядзіцца не вельмі святочна — калі шчыра, іх нават шкада. Тым больш, у іх адразу на ўваходзе працуе канкурэнт — мужчына з гучнагаварыцелем рэкламуе пяргу. Паводле гэтага спадара пярга — незаменны лекавы сродак, бо лечыць ад усяго: ад бранхіту да імпатэнцыі. Спіс хвароб настолькі доўгі, што мінакам складана зарыентавацца, што менавіта рэкламуе мужчына. Скончыўшы з пералікам хвароб, ён выказвае наступнае меркаванне:

— Для беларусаў найкарыснейшы беларускі мёд! Таму купляйце наш!

На латках выстаўлены скрыначкі з мёдам: «ліпавы», «грэцкі», «майскі», «кветкавы», «каштанавы» і г.д. Акрамя беларускага, ёсць і алтайскі, і знакаміты башкірскі, і таежны... Цэны ад 20 да 60 тысяч за кілаграм. Амаль усіх засмучае чарнічны мёд. Пакупнікі, што займаюцца дэгустацыяй усіх сартоў ля аднаго з латкоў, распачынаюць спрэчку:

— Ты бачыў калі-небудзь кветкі чарніцаў? Як з іх мёд сабраць? Там пчала не ўлезе ў кветку аніяк. Ці яны гэтых пчол на ланцужку трымаюць?

— А я кажу, бывае чарнічны мёд. Вунь з дзівасіла ёсць, дык чаму ж з чарніц не будзе?

Як высветлілася, з чарніц насамрэч збіраюць мёд, і, дарэчы, у вялікай колькасці — але, як выглядае сам працэс, уявіць складана, і ведаюць толькі пчолы.

Акрамя дзясяткаў гатункаў мёду, прадаюцца на кірмашы і тавары-сабстытуты: пярга, пчаліны падмор. Прылятаюць і самі вытворцы, што трошкі раздражняе і прадаўцоў, і пакупнікоў: толькі распачнеш дэгустацыю, а ўжо трэба хуценька адганяць ад сябе пчалу.

Але не мёдам адзіным жыве мядовы кірмаш. Напрыклад, існуе асобны стол, за якім гандлююць валёнкамі. Якаснымі, цёплымі — ад аднаго погляду на іх у спёку хочацца абліцца чым-небудзь халодным. Менавіта таму гара валёнкаў неяк і не змяншаецца.

Ля валёнкаў гандлююць цёплымі шкарпэткамі з сабачае поўсці і сумкамі з парашутнага шоўку. Вось гэтыя сумкі прадаюцца лепш за астатняе.

Ля іх гандлююць «свежымі тульскімі пернікамі», да якіх пакупнікі ставяцца насцярожана — спалучэнне слоў «тульскія» і «свежыя» прымушае іх задавацца пытаннем: «А дзе тая Тула знаходзіцца?» Хаця, зразумела, што прынеслі пернікі не хадакі.

Але галоўнае — мёд, і гандляры наперабой прапануюць свой тавар:

— Толькі ў нас сапраўдны беларускі мёд!

— Кветкавы мёд! Падыходзьце, я вам усё раскажу — я вельмі цікава расказваю!

— Зніжкі!

Пры ўдакладненні пра зніжкі высвятляецца, што існуе «гібкая сістэма» для пенсіянераў, якія бяруць больш за дзесяць кілаграмаў, — вось ім і будзе зніжка. Кілаграм каштуе 30 тысяч. Навошта купляць адразу дзесяць? А каб расфасаваць пасля па слоіках і перапрадаць, хаця з такімі цэнамі, як на кірмашы, зрабіць тое абсалютна немэтазгодна.

А вось для аматараў «мядовай халявы» такі кірмаш — проста рай, кожны з гандляроў прапануе прадэгуставаць кожны сорт, так што мёду можна надэгуставацца да наступнага кірмашу.

**Юрась Ускоў**



**Як выбраць якасны мёд?**

Не памыліцца, купляючы мёд, цяжка. Спадзяёмся, гэтыя парады дапамогуць вам набыць якасны і карысны мёд.

1. Водар у мёду павінен абавязкова быць. Калі вы не адчуваеце водару, значыцца вам трапілася натуральная падробка. Чым гусцейшы водар, тым лепшая якасць мёду, хаця трэба ўлічваць, што водар, а таксама яго сіла ў розных сартоў можа быць розная.

2. Смак сапраўднага мёду павінен быць салодкі, без староннiх адценняў, а пры дэгустацыі сапраўдны мёд аказвае раздражненне на слізістую абалонку. Ад падробкі такога эфекту чакаць не варта. Мёд з карамельным прысмакам — ужо не свежы, а значыць, гаючых якасцяў не мае.

3. Сталасць мёду можна вызначыць, накручваючы яго на лыжку ці паліваючы на лязо нажа — сталы, якасны, гатовы да ўжывання мёд не будзе сцякаць ні з лыжкі, ні з нажа.

# Як не плаціць за гатэль на адпачынку

Скарыстайце гасцявыя сеткі.

Гасцявыя сеткі — гэта супольнасці людзей, аб’яднаных на пэўным сайце. Ідэя ў тым, што кожны зарэгістраваны сябар прапануе ў сябе пагасцяваць іншаму чалавеку задарма. І гэта не толькі магчымасць танна павандраваць бедным студэнтам. Сярод сяброў гасцявых сетак хапае забяспечаных людзей. Для чаго яны гэтым займаюцца? Адным падабаецца вандраваць. Іншыя любяць прымаць у сябе замежных гасцей. Трэцім падабаецца бачыць лад жыцця людзей у розных краях. У любым выпадку гэта пастаянныя кантакты з новымі людзьмі. А для тых, хто вывучае замежныя мовы, яшчэ і магчымасць папрактыкавацца.

Безумоўна, пры такім прыёме ёсць пэўныя абмежаванні, якія залежаць непасрэдна ад кожнага чалавека. Адны забараняюць паліць у кватэры, іншыя не дазваляюць позна вяртацца. А калі гаспадар працуе з раніцы да вечара, то вам трэба падладжвацца пад яго графік. Здараецца, што даводзіцца пакідаць кватэру на цэлы дзень і вяртацца толькі ночыць. Але гэта не страшна. Варта тады кантактаваць з іншымі сябрамі сеткі. Заўжды знойдуцца тыя, хто пакажа вам горад, сходзіць разам у кавярню.

Як правіла, спыняюцца на некалькі дзён (тэрмін абгаворваецца папярэдне). Грошы за пражыванне не бяруцца. Але гаспадар не абавязаны карміць госця ці прыбіраць за ім. Усё па жаданні.




Пасля наведвання госць звычайна на старонцы гаспадара пакідае водгукі. Ад іх колькасці і зместу залежыць давер да гэтага чалавека.

Пры рэгістрацыі ў гасцявых сетках трэба запоўніць анкету, у якой, акрамя біяграфічных дадзеных, указваюцца хобі, зацікаўленасці. Можна загрузіць фота. Чым больш пазначана інфармацыі пра сябе, тым большая верагоднасць, што да вас звернуцца па дапамогу.

Найбуйнейшыя гасцявыя сеткі — CouchSurfing і The Hospitality Club.

Couchsurfing.org — гэта больш за 2 мільёны карыстальнікаў з 230 краін. Hospitalityclub.org аб’яднала больш за 300 тысяч зарэгістраваных сяброў з двухсот краін.

Існуюць і іншыя сеткі, але яны саступаюць па колькасці людзей: Bewelcome.org, place2stay.net, flatjump.com, globalfreeloaders.com.

Ёсць спецыялізаваныя рэсурсы. Pasportaservo.org, напрыклад, аб’ядноўвае эсперантыстаў (хто валодае мовай эсперанта) па ўсім свеце. Warmshowers.org арыентаваны на тых, хто вандруе на роварах.

Рэгістрацыя амаль усюды бясплатная.

Беларусы таксама актыўна карыстаюцца гасцявымі сеткамі. Яны не толькі выязджаюць за межы краіны, але і самі прымаюць гасцей.

«Да мяне прыязджала шмат замежнікаў, бывала і па тры чалавекі, — расказвае Антон з Мінска, які ўдзельнічае ў гасцявых сетках ужо тры гады. — Ніякіх праблем з імі не было. Адзінае, што не мог іх зарэгістраваць у Мінску, бо сваёй кватэры не маю. Здзіўляе, што адмыслова ў Беларусь едуць заходнееўрапейцы: галандцы, датчане, славакі, чэхі. Ім тут цікава паглядзець на савецкі лад жыцця, «апошнюю дыктатуру Еўропы», якая хутка можа знікнуць. А вось з Расіі прыязджаюць, каб наведаць еўрапейскую краіну, у якую не патрэбная віза. Адна амчанка ехала з уяўленнем, што ў нас адны лясы, разбітая краіна. І калі ўбачыла тое, што ёсць насамрэч, радавалася. Фоткалася побач з кожным кустом. Яе ўразілі каштаны, якія ў Омску не растуць».

**Кастусь Матушыч**

## Сапраўдная беларуская кухня

### Зразы з паляндвіцы інакшыя

1—1,5 кг паляндвіцы ці іншага мяса, 8—10 сухіх грыбоў, 2 цыбулі, 2 лыжкі масла, 3 яйкі, 200 г саланіны, 5—6 лыжак цёртай булкі, соль, перац.

Мяса для зразаў, найлепш паляндвіцу, добра ачысціць, пасекчы, убіць 3 яйкі, вымешаць і раскласці на дошцы кругам таўшчынёй з мезены палец (як звычайна раскладаецца цеста для макароны).

Адварыць сухія грыбы, дробна пасекчы, дадаць 200 г адваранай і дробна пасечанай свежай саланінкі, некалькі нарэзаных і падсмажаных у масле цыбулін, трохі цёртай булачкі, пасаліць, у меру папярчыць і добра вымешаць усё разам. Палажыць гэты фарш на пасечанае мяса, звярнуць у трубку і, паклаўшы масла, тушыць у рондалі.

Падаючы, нарэзаць мяса на кавалкі і заліць соусам, у якім мяса тушылася.

**З кнігі Вінцэнты Завадскай «Літоўская кухарка», 1854**
**Падрыхтавала НБ**

## Прыватныя абвесткі

**КВАТЭРА**

**Беларускамоўная сям'я** ў складзе мужа і жонкі здыме 1-пакаёвую кватэру ў Мінску. Т.: (025) 935-11-41.

**ПРАЦА**

**Шукаю выкладчыка** матэматыкі для заняткаў з вучнямі 8-9 класаў. Т.: (029) 774-22-47.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## Кемікі



1) Чаго ў сабакі ёсць тры, у сарокі дзве, у лісы адна, а ў пеўня зусім няма?

2) У капусце я ёсць, у цыбулі няма, у карасі ёсць, у шчупаку няма.

3) Ёсць у полі і ў лузе, а ў агародзе мяне няма. Я ёсць у цыбулі, а ў моркве мяне няма.

**Сабрала Валянціна Карнялюк.**
**Адказы глядзі на старонцы 16.**



# Вяселле Шапуцькі й Лабадзенкі адбылося ў Нясвіжы

**Глеб і прыгажуня Таццяна ўзялі шлюб 13 жніўня ў гарадской Ратушы.**

24-гадовы Глеб Лабадзенка працуе журналістам у газеце «Звязда». Ён вядомы таксама як паэт і як блогер. Таццяна Шапуцька стала вядомай, калі яе выключылі з БДУ. Так яе пакаралі за пропуск заняткаў для ўдзелу ў Форуме грамадзянскай супольнасці Усходняга Партнёрства ў Брусэлі. Не дапамогло ані тое, што яна была выдатніцай, ані заступніцтва еўрапейскіх міністраў. Цяпер 20-гадовая намесніца старшыні Маладога Фронту Таццяна Шапуцька вучыцца на трэцім курсе Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта.

Вянчанне адбылося ў Фарным касцёле Божага Цела. Цяперашнія муж і жонка не змянялі сваіх прозвішчаў. Апроч сяброў і родных павіншаваць маладых з вяселлем прыйшлі Кася Камоцкая, Лявон Вольскі. Адмысловым госцем была **княгіня Альжбета Радзівіл (на другім фота)**, апошняя гаспадыня Нясвіжскага замка, якая на лета прыехала ў Беларусь.

Сведкамі на вяселлі былі журналіст (а таксама кікбаксёр і бард) Яўген Валошын і іншая красачка з Маладога Фронту Наста Палажанка.

Вяселле ладзілася ў атмасферы беларускіх традыцыяў. Жаніх і нявеста былі ў святочных нацыянальных строях, многія госці таксама надзелі вышыванкі. У Нясвіжскім замку адбыўся невялічкі фуршэт, асноўнае святкаванне праходзіла ў аграсядзібе пад Мінскам. Увечары маладых прывітаў салют.

**Андрэй Маўрукевіч, Нясвіж—Мінск, фота Насты Лойка**








**15 жніўня рок-каралю і лідэру гурта «Крама» Ігару Варашкевічу споўнілася 50 гадоў.**



**Байкеры зладзілі ў Новай Зеландыі парад бюстаў. Здавалася б, прычым тут матацыклы?**

## Анекдоты



* * *

— Зараз я буду рваць вам зуб, а вы крычыце як мага мацней, — кажа стаматолаг пацыенту.

— Што, будзе нясцерпна балюча?

— Ды не, проста да мяне вялікая чарга, а я спазняюся на футбол...

* * *

Спакота прымусіла жанчын адзявацца так, што продажы эратычных часопісаў упалі да нуля.

* * *

— Я бачыў гэты спектакль. Раю вам сыходзіць пасля другога акта.

— Чаму пасля другога?

— Пасля першага вельмі ўжо вялікая цісканіна ў гардэробе.

* * *

Беларускі лось-прадказальнік Уладзімір вызначыў вынік жніва. Як і кожны мінулы год, яму паставілі дзве кармушкі, на адной з якіх было напісана «больш за 10 млн», а на іншай — «менш за 10 млн». Восем разоў запар ён падыходзіў да кармушкі са знакам менш, аднак атрымліваў па мордзе. Урэшце тую кармушку зусім прыбралі, і Уладзімір вызначыўся. Аграрыі не могуць нарадавацца, бо на працягу 15 гадоў лось ні разу не памыляўся. Дый сама жывёла пачала разумець, што вялікія намалоты ў інтарэсах усёй краіны.

* * *

— Ой, дзеўкі, які ў каго самы любімы момант у сварцы? У мяне — гэта калі ён толькі заходзіць у хату...

## «НН» сто гадоў з вамі

**Кленікі Бельскага павета.** У тутэйшых мясцах з'явіліся нядаўна суслікі. Гэта маленькія звяркі, падобныя да мышэй, толькі крыху большыя. Там, дзе іх многа плодзіцца, яны робяць аграмадныя шкоды людзям, бо малоцяць на полі збажыну і хаваюць у зямлю на зіму сабе. Людзі вельмі спалохаліся, бо не ведаюць, як ад гэтых суслікаў бараніцца.

**«НН». № 31. 1910.**

**У Мінску забіты лідэр тутэйшага аддзялення РНЕ Г.Самойлаў.** Забойства мясцовага фюрэра можа прывесці да развалу адыёзнай суполкі як такой. Рух славянскіх шавіністаў у Беларусі абапіраецца на купку асобаў, што раздзімаюць яго, выкарыстоўваючы высокае асабістае становішча. Як толькі гэтыя людзі знікнуць, увесь іхні гучны рух сыдзе на нішто.

**«НН». № 32. 2000**

**Адказы на кемікі са старонкі 15.**

1) Літара «а». 2) Літара «с». 3) Літара «л».

**Наша Ніва**
незалежная газета
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).
сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
шэф-рэдактар Андрэй Дынько
галоўны рэдактар Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.
**Наклад 6370.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 17.08.2010.
Замова № 4015.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614